Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не варочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

КОШТ НУМАРУ 5 КАП.

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Выезд адрасу: іншагародняя	— 20 к.
сяцовыя	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок шматарозі мясьцы тэксту — р. 50 к.
За радок шматарозі мясцовы тэксту 1 р. — к.
За радок шматарозі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьпешныя на 50 проц. даражэй.
Зьмы тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 друкаваны . . . 35 коп.
За кожны дадатковы . . 15 „
Беспрацоўн. і чырвонармейцы за друкаваны . . 15 „
За кожны дадатковы . . 5 „
Публікацыі ЗАГСу—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА у канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 76 (2264) Пятніца, 30-га сакавіка 1923 г.

Нямеччына на раздарожжы.

Падзеі апошніх тыдняў кідаюць яскравы сьвет на крутыя зьвілины тых шляхоў, па якіх праходзіць палітыка сучаснай Нямеччыны.

З аднаго боку, нямецкая дэлегацыя ў падрыхтоўчай камісіі па разброеньні падтрымала ўсе выступленьні тав. Літвінава. Нямецкі друк аднадушна адобрыў гэтае падтрыманьне, зазначаючы на важнасьць для Нямеччыны палітычнага супрацоўніцтва з СССР.

З другога боку, той-жа нямецкі друк два тыдні таму назад пачаў, а часткова і цяпер працягвае, супроцьсавецкую кампанію ў зьвязку з арыштам у СССР нямецкіх інжэнэраў, якія прымалі ўдзел у контр-рэвалюцыйнай змове. Нямецкі ўрад таксама ўдзельнічае ў гэтай кампаніі. Карыстаючыся рыштам інжэнэраў, ён прыпыняе эканамічныя перагаворы з СССР.

Усім ясна, што Нямеччына ня ідзе простым палітычным шляху. Яна ўкідаецца з боку ў бок. Яна зноў ціць на раздарожжы.

Мы гаворым зноў—таму, што за апошнія гады нямецкаму ўраду ня раз даходзілася натыкацца на неабходнасьць нялёгкага выбару паміж палітыкай зьбліжэньня з СССР і палітыкай зьбліжэньня з усімі ранейшымі пераможцамі—Англіяй і Францыяй. Неабходнасьць выбару нямінуча ўзьнікае для Нямеччыны кожны раз, калі Францыя і Англія асабліва востра выступалі супроць СССР.

Менавіта гэткі-ж момант надышоў і зараз.

За апошнія тыдні мы рэгіструем спробы Францыі захапіць у Амэрыцы нашае золата і такім чынам паставіць перашкоды на шляху разьвіцьця савецка-амэрыканскага гандлю. Далей мы рэгіструем назначэньне ў Францыю новага англійскага пасла Ціррэля, прычым—згодна думкі ўсіх буйнейшых буржуазных газэт Эўропы—ён назначэцца спэцыяльна для таго, каб нацкоўваць Францыю супроць СССР.

Нарэшце, на апошній сэсіі савету Лігі Нацый (у пачатку сакавіка) Чэмбэрлен і Брыян (францускі міністр замежных спраў) арганізавалі сапраўдную змову супроць СССР. Аб гэтым апавядае вядомы журналіст Аўгур, які мае блізкую сувязь з англійскім міністэрствам замежных спраў.

Як відаць з слоў Аўгура, Чэмбэрлен і Брыян дамагаліся ад Штрэзэмана (нямецкага міністра замежных спраў), каб ён перарваў нямецка-савецкія эканамічныя перагаворы. Штрэзэман згаджаўся на гэта. Тым больш, што ён ня ў тым-жа супроцьсавецкім кірунку рабілі націск некаторыя англійскія фірмы, нездаволеныя нашай індустрыялізацыяй і ростам гаспадарчай самастойнасьці СССР.

Такім чынам, якая скрытая мэханіка, выклікала прыпыненьне нямецка-савецкіх перагавораў і супроцьсавецкую кампанію нямецкага друку. Важна, мэханіка гэта пачала дзейнічаць ў пачатку сакавіка, г. зн. да арышту нямецкіх інжэнэраў у СССР. Арышт інжэнэраў зьявіўся, такім чынам, толькі першай зручнай прычынай для супроцьсавецкіх выпадаў, якія на справе былі выкліканы тым, што нямецкі ўрад кінуўся ў бок ранейшых пераможцаў.

Аднак, ухіліўшыся ў гэты бок, Нямеччына раптам спынілася ў нерашучасьці. Зразумела—чаму.

І Англія і Францыя вельмі хацелі-б выкарыстаць Нямеччыну для барацьбы проці СССР. Яны дамагаюцца таго, каб Нямеччына парвала сувязь з Савецкім Саюзам і зблізілася з ранейшымі пераможцамі. Але ў той час «пераможцы» баяцца пераможанай Нямеччыны.

Француская буржуазея бачыць страшэнныя сны аб адраджэньні нямецкай ваеннай магутнасьці, ангельская бачыць наяве шпаркае адраджэньне нямецкае прамысловасьці і гандлёвай канкурэнцыі.

Ні Англія, ні Франція не жадаюць таму ісьці насустрэч колькі небудзь значным палітычным патрабаваньням Нямеччыны. Яны не згаджаюцца дазволіць павялічэньне нямецкіх ваенных сіл. Яны не зварочваюць Нямеччыне адабраных у яе калёній. Яны адкладаюць вывад англа-францускага войска з Рэйнскае вобласьці (заходняя частка Нямеччыны).

Між тым уласна надзеі на ажыцьцяўленьне гэтых патрабаваньняў ляжаць у аснове тых палітычных крокаў, якія Нямеччына за апошнія тры гады рабіла ў бок зьбліжэньня з ранейшымі пераможцамі (Лёкарнскі дагавор, уступленьне ў Лігу Нацый). Поўнае зруйнаваньне нямецкіх надзей—вось пакуль што вынікі гэтай палітыкі.

Але, можа быць, надзеі яшчэ ажыцьцёвяцца ў далейшым? Быць можа Англія і Франція ўсё-ж згадзяцца задаволіць нямецкія патрабаваньні ў абмен за згоду Нямеччыны парваць сувязь з СССР?

Гэткага роду разьлікі ня спыняюць уплываць яшчэ на нямецкую палітыку. Гэтым, а таксама як і жаданьнем зрабіць нажым на СССР, і тлумачыцца прыпыненьне нямецка-савецкіх перамоў.

Але з другога боку, нямецкая буржуазея добра разумее, што нельга цалком грунтаваць сваю палітыку на гэтых, ужо ня раз ашукаўшых, разьліках. Больш таго. Яна разумее, што, абапіраючыся на добрыя адносіны з СССР, куды лягчэй вырваць у ранейшых пераможцаў якія-небудзь уступкі.

Вось чаму, ухіліўшыся ў бок ранейшых пераможцаў, нямецкая буржуазея спыняецца ў нерашучасьці і нават зноў нібы ўхіляецца ў бок СССР. Вось чаму некоторыя нямецкія газэты, якія пядаўна вялі суровую антысавецкую кампанію, цяпер рашуча заяўляюць, што Нямеччына не павінна адмаўляцца ад палітыкі зьбліжэньня з Савецкім Саюзам.

Канстытуцыя Польшчы пад ботам Пілсудзкага.

„Выпадак, роўназначны дзяржаўнаму перавароту".

УСЯ АПАЗІЦЫЙНАЯ ПРЭСА АЦЭНЬВАЕ ВЫСТУПЛЕНЬНЕ ПІЛСУДЧЫНЫ З АБУРЭНЬНЕМ.—ОРГАНЫ ПІЛСУДЧЫКАЎ ПАГРАЖАЮЦЬ СОЙМАВАЙ ЛЯВІЦЫ АДПЛАТАЮ.

ВАРШАВА, 28-3. На думку ўсіх газэт, дэманстрацыя камуністаў у сойме ў дзень адчыненьня прайшла вельмі ўдала, бо ім удалося ўцягнуць у яе частку радыкальных украінцаў і аднаго дэпутата «Вызваленьня».

«Роботнік» піша: «Упяршыню за час існаваньня незалежнае Польшчы ўчора ў залі ўвайшла паліцыя па загадзе прэм'ера і пад ўласным кіраўніцтвам міністра ўнутраных спраў. Урад як відаць, парашыў вярнуцца да спэкуляцыі на людзкой палахлівасьці і спрабуе запалохаць сойм рэпрэсіямі ў адносінах да асобных дэпутатаў. Сойм не спалохаўся і адказаў на гэта абраньнем Дашынскага. Міністр унутраных спраў Складкоўскі выступіў у ролі звычайнага камісара паліцыі, забыўшы, што ён міністр».

„Рэч Паспаліта" заяўляе: «Гісторыя парлямантарызму ведае выпадкі зьяўленьня паліцыі ў залі пасяджэньняў, але толькі пры дзяржаўных пераваротах. Ужо пры адчыненьні сойму ўрад паказаў, што ён ня мае намеру лічыцца з парлямантскімі звычаямі". Газэта падкрэсьлівае, што правал ураду пры абраньні старшыні сойму сьведчыць аб узмацненьні пазіцыі левых у новым парляманце.

Газэта віцэ-прэм'ера Бартэля «Эпока» спрабуе даказаць, што ўчынкі ўраду зьяўляюцца законнымі, бо дэпутаты да прысягі не карыстаюцца недатычнасьцю.

„Неабходна сьцьвердзіць адно,—заяўляе газэта,—што камуністычная дэманстрацыя не прайшла не замечанай. Яна стварыла ў сойме настрой, якія на агульную думку вельмі небясьпечны для яго і згубны для дзяржавы. Інакш нельга растлумачыць мабілізацыю ўсіх партый проці кандыдатуры, пажаданае ўраду, і абраньне Дашынскага, якое ня можа быць растлумачана інакш, як выклік ураду».

«Глос Правды» (орган пілсудчыкаў) заяўляе, што „лявіца пайшла проці інтарэсаў дзяржавы. Ёй прыдзецца паплаціцца за гэтую перамогу: учарайшыя пераможцы будуць гэтым нездаволены».

ПЕРШАЯ ПРАМОВА ДАШЫНСКАГА Ў СОЙМЕ.

ВАРШАВА, 28. Маршалак сойму Дашынскі ў сваёй першай прамове, прымаючы пасаду, падкрэсьліў—праўда, павярхоўна—драматычны характар першага пасяджэньня сойму.

Старшыня соймавага клюбу «Вызваленьня» Вазьніцкі выступіў з заявою, у якой заплянаваў незаконны арышт дэпутатаў у памяшканьні сойму, зазначыўшы, што гэта зьяўляецца парушэньнем канстытуцыі.

МАГЧЫМА АБ'ЯДНАНЬНЕ СЕЛЬРОБУ

ВАРШАВА, 28-3. Правы Сельроб распачаў перамовы з прадстаўнікамі аб'яднанага Сельробу, на чале з Дурдэлай, і прадстаўнікамі левага Сельробу аб аб'яднаньні ўсіх груповак Сельробу.

ЗАЦЬВЯРДЖЭНЬНЕ КАНФІСКАЦЫІ «РОБОТНІКА».

Акруговы суд у Варшаве зацьвярдзіў канфіскацыю № 76 пэрэсаўскага «Роботніка» за артыкулы: «Кандыдатура п. Бартэля» і „Гнев і Правда".

Склад камфракцыі сойму.

ВАРШАВА, 28. У склад камфракцыі сойму ўваходзяць наступныя асобы: ВАРСКІ (старшыня) і СЫПУЛА (каменьшчык)—*ад Варшавы*, БІТНЭР (столяр) і РОСЯК (тэкстыльшчык)—*ад Лодзі*, САХАЦКІ, БАЧЫНСКІ (гарнякі) і ГАЎРОН (гарняк)—*ад Дамброўскага басэйну.*

АРЫШТЫ.

«Дзеньнік Віл.» (№ 68) паведамляе, што ўночы з 20 на 21 сакавіка г. г. паліцыя арыштавала ў поезьдзе на лініі Ліда-Наваградак дзьве асобы, у якіх знойдзены шыфр, карэспандэнцыя, камуністычная літаратура, 800 даляраў і інш. манэты. Прозьвішчаў гэтых асоб газэта не падае.

ЭЛЕКТРЫФІКАЦЫЯ ПОЛЬШЧЫ.

20 сакавіка г. г. у Варшаве адбудзецца канфэрэнцыя прадстаўнікоў ураду, дырэктароў большых электрычных станцый у Польшчы і прадстаўнікоў самаўрадаў па пытаньні аб асновах супрацоўніцтва камунальных электрычных станцый і скардынаваньня іх дзейнасьці з дзейнасьцю краёвых электрастанцый.

ПАЖАРЫ Ў ЛОДЗІ.

У Лодзі гэтымі днямі было некалькі пажараў. Згарэў адзін магазын і фабрыка братоў Лазэ.

ПАНСКІ КАТ.

„Двуграшоўка" п. Садзевіча дае вобразны малюнак першага выступленьня дзяржаўнага польскага ката ў Беластоку.

«Кат выступіў убраны ў чорны сурдут, цыліндар, белыя рукавічкі і чорную шоўкавую маску. Калі Стаськевіч (прысуджаны) павіс на вяроўцы, павешаны памоцнікам ката, кат падбег і адным ударам у сьпінны слуп зламаў яму карак, з прычыны чаго сьмерць наступіла тут-жа.

Гэта—адзіная функцыя ката пры экзэкуцыі. Выканаўшы яе, кат скінуў рукавіцы кала ног павешанага".

Ня была-б то панская Польшча—іменна „панская", якая нават такі факт, як дзяржаўнае забойства, абстаўляе бутафорскім маскарадам. Гэты арыстакратычны панскі садызм выклікае толькі адну агіду.

Растрэл дэманстрацыі гібралтарскіх грузчыкаў.

ЛЁНДАН, 28-3. Распачатая ў студзені ў Гібралтары забастоўка грузчыкаў ня спыняецца. Прадпрыёмцы прывезьлі з Марока арабаў у якасьці штрэйкбрэхераў. Паліцыя арыштавала 36 рабочых з групы, якая падышла да вугольных складаў, каб пераканаць арабаў спыніць працу. Некалькі сот рабочых накіраваліся да дому губарнатара, патрабуючы вызваленьня арыштаваных. Пасьля адмовы губарнатара прыняць прадстаўніка рабочых дэманстранты напалі на будынак паліцэйскага кіраўніцтва, спрабуючы вызваліць арыштаваных. Паліцыя страляла.

СЯРОД РАБОЧЫХ ШМАТ ЗАБІТЫХ І ПАРАНЕНЫХ.

ПАДАГУЛЕНЬНЕ СІЛ АРМІІ НЯМЕЦКАЕ РЭВАЛЮЦЫІ.

НА ЗЬЕЗЬДЗЕ НЯМЕЦКІХ ЧЫРВОНЫХ ФРАНТАВІКОЎ.

БЭРЛІН, 28-3. Галоўным пытаньнем нарадку дню агульна-нямецкае канфэрэнцыі чырвонага саюзу франтавікоў, якая адбываецца ў Гамбурзе, быў палітычны даклад Тэльмана. Тэльман зазначыў, што за справаздачны год чырвоны саюз франтавікоў дасягнуў вялікіх посьпехаў у сэнсе росту і ўзмацненьня ідэалёгічнае адзінасьці.

Падкрэсьліваючы ўзмацненьне наступу буржуазнага блёку на рабочую клясу і рост актыўнасьці фашыстаў, Тэльман зазначыў, што галоўнымі задачамі саюзу чырвоных фронтавікоў на будучы год павінна быць павялічэньне ліку сяброў арганізацыі ва 25 проц., узмацненьне працы саюзу на надыходзячых парляманцкіх выбарах і ў надыходзячых бойках між працаю і капіталам, узмацненьне рэвалюцыйнага фронту і згуртаваньне ўсіх сіл нямецкае рабочае клясы для больш дзейнае барацьбы чырвонага фронту проці імпэрыялізму і ў абарону СССР.

Канфэрэнцыя адназгодна ўхваліла рэзалюцыю аб палітычным становішчы і задачах чырвонага саюзу франтавікоў. Перабраны ранейшы склад выканкому саюзу папоўнен некалькімі рабочымі.

ЧЖАН-ЦЗО-ЛІН АДДАЎ МАНЧЖУРЫЮ ЯПОНІІ.

ШАНХАЙ, 26-III. Водлуг паведамленьняў нанкінскага ўраду, Чжан-Цзо-Лін, нібыта, падпісаў тайную згоду з Японіяй. Водлуг гэтае згоды Чжан-Цзо-Лін, нібы, надае Японіі права экспляатаваць лясы і выкапальныя багацьці Манчжурыі. Японіі надаецца таксама выключнае права на чыгуначнае будаўніцтва ў Манчжурыі. Узамен гэтых уступак Японія павінна будзе абвясьціць Мукдэнскую правінцыю нэйтральнаю зонаю, калі войска нанкінскага ўраду прасунецца на поўнач Кітаю.

Аўганскі падышах прыедзе ў СССР.

ЛЁНДАН, 28. Аўганская місія ў Лёндане катэгарычна адхіляе чуткі, што адмена наведаньня падышахам тэатру, якое меркавалася ў панядзелак, знаходзіцца ў сувязі з палітычнымі непаразумкамі ў Аўганістане. Першапачатковы праэкт падышаха прадоўжыць падарожжа ў Злучаныя Штаты адменен. Мяркуецца, што падышах пакіне Англію 5 красавіка і выедзе ў Маскву праз Парыж-Бэрлін-Варшаву.

Перамога шансійцаў над Чжан-Цзо-Лінам

ШАНХАЙ 27-III. Як даносіць штаб шансійскага губарнатара Ен-Сі-Шана, шансійскае войска разьбіла мукдэнцаў у раёне Пінь-Інгуну (у паўно[illegible] усходняй частцы правінцыі [illegible] Мукдэнскае войска паспрабав[illegible] наступаць, аднак было [illegible] нута і адступіла ў рай[illegible] чжоу ў паночна-усхо[illegible] сі, (за 140 кілёмэт[illegible] Чжылійскае мяж[illegible]

УХАНЦЫ

[illegible]

ПРАЦЭС ГРАМАДЫ.

19 і 20 дні працэсу.

ВІЛЬНЯ, 29-3. У 19-ты дзень працэсу Беларускай Грамады цягнуўся допыт сьведак.

Сьведка Цясьлюк, які перадаў судоваму сьледавацелю «весткі» аб распаўсюджаньні камуністычнай літаратуры, цяпер адмаўляецца ад сваіх ранейшых паказаньняў. Як высьвятляецца, паліцыя тэрарызавала сьведку і наўчыла яго, што ён павінен гаварыць следавацелю. Сьведка сам прыцягнут к суду за прыналежнасьць к „патайнай арганізацыі, якая імкнулася к нізрынуцьцю існуючага ладу". У турме ён сядзеў усяго тры тыдні. Абарона мысьліць, што сьведку абяцалі спыніць яго справу, калі ён будзе даваць патрэбныя паказаньні супроць членаў Грамады.

Вялікі скандал на допыце сьведкі Сахачынскага, тайнага агэнта горадзенскай паліцыі. Сьведка характарызуе (падсудных Шушкевіча, Барліцкага і Падзубыка, як «заўзятых камуністаў». Сьведка заяўляе, быццам Шушкевіч «вынес сьмяротны прысуд Гурыну (праваканатару) разам з Падзыбакам, які прымаў удзел у першым замаху на Гурына у горадзе Горадні». Падсудны Падзыбак устае і крычыць сьведку: «Наглая мана!» Старшыня загадвае вывесьці Падзыбака з залі суду. Падзыбак выходзіць і крычыць: „Гэта новая праваканыя паліцыі!"

У 20-ты дзень працэсу дапытваецца шэраг сьведак абвінавачваньня, галоўным чынам агэнты ахранкі, шпікі і паліцэйскія. Галоўным момантам дня зьяўляецца допыт сьведкі Крошака (лясьнік, які забіў у мінулым годзе аднаго селяніна). У свой час суд вызваліў Крошака з прычыны «налічча умоў, якія зьмякчалі віну». На допыце высьвятлятецца, што Крошак быў тайным агэнтам паліцыі.

Сьведка абвінавачаньня Барушка сьцьвярджае, быццам дэпутаты Грамады атрымлівалі грошы з СССР і разьмяркоўвалі іх між паасобнымі ячэйкамі Грамады. Як высьвятляецца праз скрыжаваны допыт, сьведка у мінулым судзілі за прыналежнасьць к кампартыі, з прычыны таго, што ён здрадзіў сваім таварышом і [illegible] даў іх, быў засуджаны толькі да 6-ці месяцаў турмы, прычым выкананьне прысуду было адкладзена на два гады.

У Саюзе ССР.

Юбілей Максіма Горкага.

Прывітаньне юбіляру ад УЦСПС

МАСКВА, 28-III. УЦСПС зьвярнуўся да Горкага з прывітальным лістом, у якім гаворыцца: „У часе пабыту далёка ад бацькаўшчыны сочыце Вы за культурным ростам пралетарыяту СССР і сваімі парадамі і заўвагамі аказваеце дапамогу і маральнае падтрыманьне пачынаючым пісьменьнікам з рабочага асяродку. Гэта дае нам, Алексей Максімавіч, упэўненасьць, што, зарнуўшыся да нас, Вы, як і раней, будзеце ў шэрагах актыўных барацьбітоў за новае жыцьцё, новую культуру. Упэўнены, што вялікі талент пісьменьніка-пралетарыя, пісьменьніка-барацьбіта і рэвалюцыянэра і ў далейшым будзе служыць справе рабочае клясы, а таксама праці, дзе будуецца сацыялізм".

Ліст М. Горкага тульскім рабкорам.

ТУЛА. 28-III. Максім Горкі прыслаў тульскім рабкорам і сялькорам такі ліст: «Па першае, выказваю ўдзячнасьць за прыцельскі ліст; прыемны мне яго бадзёры тон і малодзіць мяне, старога, вашае разуменьне важнасьці працы, якую вы робіце. За працаю вашага брата, рабкораў, я сачу па колькі магу, уважліва і высока цаню яе. Вашая маса павінна вылучыць для краю добрых журналістаў, людзей, якія ня зморацца ў барацьбе з парушнікамі старога. Я ведаю, што яно [illegible] ные, баліць і перашкаджае жыць [illegible] ваму, ведаю, што праца вашая рабк[illegible] ская нялёгкая. Але ведаю і тое, што рабкоры—будучая буйная сіла краю, патрэбная для асьвятленьня жыцьця шматмілённага сялянства. Вы ўжо становіцеся гэтаю сілаю. Кампліментаў я не гавару. Ну, да пабачэньня. Паціскаю вашу руку.

А. ПЯШКОЎ.

Сумленным спэцыялістам заўсёды пад трыманьне ўраду СССР

4000-ны сход інжэн.-тэхнічных працаўні[illegible]

МАСКВА, 28-III. 28-га сакавіка ў каляннай залі Дому Саюзаў адбыўся 4-хтысячны сход інжэнэрна-тэхнічных працаўнікоў Масквы і Маскоўскае губэрні, на якім з дакладам выступіў старшыня ВСНГ Куйбышаў.

У прэзыдыум пад гучныя воплескі абіраецца Рыкаў, Томскі, Куйбышаў, Крыжыжаноўскі, Лобаў, праф. Бах, Губкін, Асадчы, [illegible] і інш. [illegible] што яны сапраўды [illegible] ру. Здраднікі бу[illegible] ужыў захады, к[illegible] цаўнік, півод[illegible] поў.

Я заяў[illegible] ворыць [illegible] ва сусі[illegible] нах да[illegible]

БАРАЦЬБА РЭВАЛЮЦЫЙНАГА ПРАФРУХУ З ФАШЫЗМАМ.

З дакладу Манмусо на кангрэсе Прафінтэрну.

МАСКВА. На ранішнім пасяджэньні кангрэсу Прафінтэрну 28-га сакавіка Манмусо выступіў з дакладам аб барацьбе проці фашызму.

Фашызм,—заявіў Манмусо,—разьвіўся ад часу 3-га кангрэсу Прафінтэрну ў сусьветным абхваце. Але было-б памылкаю разглядаць фашызм па вопыце Італіі. Становішча фашызму адпавядае ў кожнай краіне палітычнаму і эканамічнаму становішчу капіталізму, а таксама [illegible] ўзроўнай [illegible] і пра[illegible] раў, але не рэфармісцкія масы. Бяздоньне між рэфармісцкімі лідэрамі і масамі ўсё паглыбляецца.

Каб пасьпяхоўна змагацца з фашызмам, рэвалюцыйныя прафсаюзы па[illegible] ны зьвярнуць увагу на штодзённую барацьбу рабочае клясы, [illegible] нуць актыўную працу сярод [illegible] фікаваных рабочых, засн[illegible] ную сувязь з заня[illegible] ні рабочымі.

„Савецкі [illegible]

У капцюрох белага арла.

«..Адказ на паўстаньне—адзін: шыбельніца,—і больш нічога. Неабходна ў адносінах да тамтэйшага насельніцтва (Зах. Беларусі) зьверху і данізу ўжыць такі тэрор, каб у яго жылах застыла кроў».
„Рэч Паспаліта" ад 2 кастр. 25 г.

А. Навачынскі, гордасьць рэакцыйнай польскай публіцыстыкі, які падпісаў артыкул, вытрымак з якога падаваен вышэй, можа лічыць сябе вельмі шчасьлівым. Яго пажаданьне ня толькі поўнасьцю збылося, але ўжо даўно перавышана стараньнямі польскай улады.

Вядома, што так званыя «мірныя» дагаворы апошняга дзесяцігодзьдзя ня толькі не ўпарадкавалі ўзаемаадносін між паасобнымі эўрапейскімі народамі, але і ня здолелі гарантаваць мінімальнай абароны правоў нацыянальных меншасьцяў у паасобных краінах. Асаблівасьцю гэта датычыцца такіх дзяржаўных новаствараньняў ваеннай эпохі, як Польшча, Чэха-Славакія, Югославія і г. д. Іронія гісторыі зьяўляецца ў тым, што, з аднаго боку, кіраўнікі лёсам пасьлявоеннай Эўропы сьпачатку на шэрагу мірных канфэрэнцый, а потым на пасяджэньнях Лігі Нацый, ні аб чым так шмат не гаварылі, як аб неабходнасьці аховы правоў нацыянальных меншасьцяў, а з другога, вайна, якая быццам вялася ў імя вызваленьня заняволеных народаў, на справе прынесла нацыянальным у рамках іншых новастварэньняў дагэтуль нечуваныя пакуты.

Вядомы буржуазны пацыфіст, кіраўнік так званага пан-эўрапейскага руху, граф Кудэнгоў-Калергі ў адным з сваіх артыкулаў пісаў, што бліжэйшымі вынікамі Вэрсальскага і іншых [illegible] з яго—мірных дагавораў зьявіліся тое, што замест аднаго Эльзасу, які павінен быў быць вызваленым, у Эўропе нарадзілася новых дванаццаць праблем, аналягічных эльзасскай-лётарынгскай.

У той дзень, калі ў Рызе быў падпісаны польска-савецкі дагавор 1921 г., на заходняй мяжы Савецкага Саюзу адначасова нарадзіліся два новыя «Эльзасы»: Заходняя Украіна і Заходняя Беларусь, якія засталіся ў руках беларуска-панскай Польшчы. З таго часу ведзьве гэтыя «акраіны» польскай жабрацкай рэспублікі абліваюцца крывёю.

[illegible] ядавалася, што ў лёсе нацыянальных меншасьцяў, стогнучых пад [illegible] панскай Польшчы, адбыходзіць [illegible] сьветлая зьмена. Гэта было ў [illegible] г., калі «левыя» прыйшлі да [illegible] амаль адначасова ў Англіі і ў Францыі. Макданальд—у Лёндане і Эрыё—ў Парыжы, жадаючы пазьбегнуць сымпатыі сваіх выбаршчыкаў, удавалі, што іх вельмі цікавіць лёс Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі. Гэта трохі занепакоіла варшаўскі ўрад,—і ён хутчэй выдаў некалькі «пазык», якія быццам мелі на мэце паляпшэньне становішча адпаведных нац[illegible]. Напрыклад, для Беларусі [illegible] народу быў праведзен [illegible] новы закон аб школе, на паперы..., які вельмі ўважліва адносіўся да [illegible] беларускага насельніцтва, да [illegible] на родную школу і г. д. Калі [illegible] замежных спраў Польшчы граф [illegible] быў заклікан міжнародным [illegible] у Жэневе да адказу за пра[illegible]ньне беларускай мовы ў школе, што парушае некаторыя пункты [illegible]ага дагавору і статуту Лігі Нацый, граф Скшынскі ўмела выставіў [illegible] сваімі судзьдзямі гэты новы дэкрэт, [illegible] аталасіў перад сваімі калегамі [illegible] пункты новага дэкрэту, якія даюць мясцоваму беларускаму насельніцтву—пры наяўнасьці 40 грамадзян, [illegible] гэтага—дамагацца выкладаньня на роднай мове. Зразумела, бесспрэчныя жэнеўскія судзьдзі былі [illegible] гэтым лібэралізмам польскай [illegible] сьлыбіні душы. Нават у культурнай [illegible] знойдзеце шмат [illegible] захваліцца гэткім [illegible] ым законадаўст[illegible] сама Польш[illegible] сабе,—гэта-ж, [illegible]кі поўэўрапейш?

[illegible] ў толькі [illegible] высокаарганізаваны [illegible] што [illegible] аб [illegible]

І тыя, што ўнодзілі розныя анкеты адносна становішча нацменшасьцяў у Польшчы, толькі для выгадных палітычных камбінацый, бывалі вельмі рады, калі ўся справа расьсьледваньня абмяжоўвалася толькі сухімі пратаколамі і фармальнымі адпіскамі. Справа, такім чынам, была скончана добра для абодвых бакоў. Людзі, якім выгадна было прыкрывацца гуманнасьцю толькі для таго, каб паказаць, што яны чымсьці адрозьніваюцца ад кансэрватараў сваіх краін, былі задаволены з таго, што ім удалося паказаць перад усім сьветам свае ўважлівыя адносіны. Разам з тым ствараласа і адпаведная рэкляма для Лігі Нацый.

Бонзуры і Макданальды абменьваліся сардэчнымі прывітаньнямі з Грабскімі і Скшынскімі, польскія прадстаўнікі сядалі ў мяккія экспрэсы, якія адвозілі іх назад на берагі Віслы,—а над стогнучай Заходняй Беларусьсю ня спыняні сьвістаць бізуны гвалтаўнікоў і садзістаў, падбухторваемых з Варшавы.

Але калі да самага апошняга часу фальшывыя абаронцы нацыянальных меншасьцяў, пакутуючых пад уціскам «маладой, але раньняй» польскай дзяржаўнасьці, мелі магчымасьць, будучы прыціснуты да сьцяны, спасылацца на тое, што да іх не даходзіць беларускі ці украінскі друк, што яны могуць судзіць аб становішчы на акраінах Польшчы толькі па афіцыйных дакладах Грабскіх і Скшынскіх,—дык зараз яны больш ня могуць карыстацца гэтымі аргумэнтамі. Перад намі—выданы Беларускім Дзяржаўным Выдавецтвам тоўсты том (каля 500 старонак) пад загалоўкам—«Запыты беларускіх дэпутатаў парляманту ў польскі сойм 1922-1926 г.г.», справядліва названы ў прадмове «Крывавай кнігай». Ні адзін фарысей з Лігі Нацый не адважыцца сказаць зараз, што ў яго няма „натрэбных даных», каб судзіць аб запраўдным становішчы ў Заходняй Беларусі.

Рэдка прыходзілася за апошнія гады знаёміцца з такімі творамі. У ім сабрана некалькі сотняў запытаў, зробленых дэпутатамі-беларусамі польскага сойму ўраду «Рэчы Паспалітай» адносна бязупынных рэпрэсій усіх выглядаў, ахвярай якіх зьяўляецца тая частка беларускага народу, якая—пасьля Рыскага дагавору—апынулася ў капцюрох белага арла.

Гэтая кніга мае шмат агульнага з кнігай Лекаша, прысьвечанай пятлюраўскім пагромам на Украіне. Абедзьве яны робяць адноўлкавае ўражаньне бязьмежнай жудасьці і зьвяўленьня перад тым, якім чынам—нават ва ўмовах агрубеньня звычаяў пасьля доўгагадовай вайны,—людзі-зьверы могуць дайсьці да гэткай ступені лютасьці і цынізму! Але тут-жа паміж гэтымі двума мартыралёгамі ляжыць істотная розьніца. У зьверствах польскай улады над насельніцтвам Заходняй Беларусі нельга знайсьці ніякіх элемэнтаў „стыхійнасьці", нельга таксама гаварыць і аб цяжкай атмасфэры грамадзянскай вайны. Што робіцца ясным нават пры бліжэйшым азнаямленьні са зьместам запытаў, гэта тое, што катаваньні і зьдзекі ўсіх выглядаў над заходнімі беларусамі ня толькі не зьяўляюцца «выпадковымі», але, наадварот, зьяўляюцца нічым іншым, як дакладным выкананьнем на практыцы дырэктыў, атрыманых мясцоваю ўладаю ад цэнтральнага ўраду.

Падабенства між „Кнігай сьмерці" Лекаша і «Крывавай кнігай» беларускіх дэпутатаў польскага сойму зьяўляецца ў тым, што абедзьве іх цяжка выкласьці ў кароткіх рысах. Рэцэнзэнт, перад якім стаіць гэта няўдзячная задача, ня ведае,—з чаго пачаць, што падкрэсьліць, на што зьвярнуць увагу чытача? Усе старонкі гэтай кнігі запытаў адноўлкава заліты крывёю нявінных ахвяр, якія зьяўляюцца нашчаснымі «казламі адпушчэньня» ўсіх тых агідных палітычных камбінацый і дыпляматычных гандляў, якія дапуп[illegible] ісправаць [illegible]

[illegible] над сьледзтвам па два, па тры гады; зьбіваньні і нячувана лютыя катаваньні ў часе сьледзтва, якія часта прыводзяць да цяжкай сьмерці «дапытваемых»; хабарніцтва і паборы з боку абласной, павятовай і г. д. улады; непасільныя, пераходзячыя нават за нормы шляхецкіх законаў, абкладаньні сялянскага насельніцтва; сыстэматычнае прыдушэньне ўсякіх культурна-асьветных пачынаньняў; прасьледваньне роднай мовы, зьнішчэньне беларускай школы і прымусовая палёнізацыя краю, якая ня спыняецца ні перад чым. Зразумела, тут пералічаны ня ўсе польскія рэпрэсіі, а толькі галоўнейшыя. Выдатнае месца сярод іх павінны заняць зьверствы, якія чыняцца над беларускім народам так званымі «ваеннымі калёністамі». Маладая польская дзяржаўнасьць можа ганарыцца перад усім цывілізаваным сьветам, прыналежнасьцю да якога яна так часта пахваляецца, гэтай сапраўдны шалёнай «вынаходкай». У мэтах прымусовай палёнізацыі краю, а таксама замацаваньня зямлі за «сапраўды польскім» насельніцтвам, урад расьсяліў—зараз-жа пасьля сканчэньня вайны—сярод беларускага насельніцтва адстаўных і запасных салдат, надзяліўшы іх зямельнымі вучасткамі за кошт мясцовага насельніцтва. Як відаць з гэтых запытаў, „ваенныя калёністы" набіраюцца панскім урадам з самых падонкаў польскага насельніцтва, якім можна даручыць жандармскія функцыі сярод беларусаў. Усё гэта—ранейшыя фэльдфэбэлі, унтэрафіцэры, паліцэйскія, агэнты дэфэнзывы, поўахранны, поўкрымінальны элемэнт, з якіх ніхто зямляробствам не займаецца. Іх галоўнае прызначэньне—весьці правакацыю сярод мясцовага насельніцтва, падбухторваючы яго па выступленьні супроць улады. Гэтыя правакатары, раскіданыя па беларускіх вёсках, зьяўляюцца для насельніцтва нейкім пужалам. Як і італьянскія фашысты, яны зьяўляюцца лепшымі памоцнікамі ўрадавых гвалтаўнікоў, удзельнічаюць у наскоках на мірнае насельніцтва, у рабунках, арыштах і катаваньнях. Гэтыя калёністы ўпісалі ў крывавую кнігу Заходняй Беларусі самыя цёмныя старонкі. Яны ўрываюцца ў хаты сялян, разганяюць вечарынкі, зьбіваюць і некаторых зьбіваюць на сьмерць. У запыце ад 8 сьнежня 1926 г. паведамляецца выпадак, калі «ў часе вясковай гулянкі, на якую прышло шмат сельскай моладзі, ваенны калёніст кінуў ручную гранату, ад якой адзін быў забіты, а трынаццаць чалавек паранена». Гэта — толькі адно з шматлікіх «выступленьняў» разбойнікаў, пад назвай ваенных калёністаў.

Што сказаць аб катаваньнях у часе сьледзтва? У некаторых вырываюць валасы з галавы, б'юць, уліваюць праз нос дапытваемых некалькі літраў вады з воцатам, ад чаго дапытваемы хутка пачынае харкаць крывёю. У сотнях дэпутацкіх запытаў вы можаце прачытаць аб тым, як няшчасных дапытваемых вешалі за ногі, білі па пятках, па бакох, сьціскалі родавыя ворганы, зьвязвалі рукі і ногі, білі «жалезнай палкай, скручанай з тэлеграфнага дроту, і салдацкай лапатай».

«25 сьнежня ўвечары,—гаворыцца ў запыце дэпутатаў Беларускага Клюбу ад 3 сакавіка 1925 году,—(арыштаваны) С. Беганскі чуў голас сваёй сястры, якая знаходзілася побач у вартаўнічым пакоі, чуў, як яна гаварыла, потым сьмех, потым сьпевы, нарэшце, плач... як аказалася, яе спайвалі гарэлкай. Раніцою зноў чуў плач і крык сястры. Аказалася, што ёй заганялі шпількі пад погці на нагах і рвалі валасы на галаве, дамагаючыся ад яе падпісаньня загадзя нарыхтаванага пратаколу». На другі дзень яго самога катавалі ў прысутнасьці сястры.

Арыштаваных сялян у большасьці катуюць у прысутнасьці родных людзей, [illegible] самае робіцца і з дзяцьмі. Усё ро[illegible] прымусіць пры[illegible] Нека[illegible]

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Аўтадор за працай.

Віцебск, 28-3. Першы агульны сход членаў - арганізатараў Віцебскага акруговага аддзяленьня Аўтадору адбыўся 26 сьнежня 1927 г. За гэты час праўленьнем прароблена вялікая арганізацыйная праца. У сучасны момант ужо арганізаваны 4 ячэйкі (пры заводзе «Чырвоны Мэталіст», у дзяржаўным палітэхнікуме, прафтэхшколе мэталістаў і на 3 дарожна-будаўнічым вучастку). Арганізуюцца і ў хуткім часе маюць быць афармлены яшчэ 3 ячэйкі. Апроч гэтага, намечана арганізаваць 11 ячэек Аўтадору ў райёнах акругі пры райвыканкомах і 2-3 ячэйкі ў тэхнічных часьцях Віцебскага гарнізону. Усяго ў горадзе зараз ячэйкамі Аўтадору аб'яднана да 400 членаў.

Вельмі цяжка арганізаваць ячэйкі Аўтадору ў райёнах акругі: апошнія на заклік акруговага аддзяленьня Аўтадору, яшчэ не адгукнуліся.

Юрыдычных членаў акруговае аддзяленьне Аўтадору мае 3.

Пастаноўлена зьвярнуцца яшчэ да 20 устаноў і прадпрыёмстваў з просьбай уступіць у юрыдычныя члены таварыства.

Для практычнай працы пры акруговым аддзяленьні Аўтадору арганізаваны 3 сэкцыі: аўта-трактарная, дарожная і арганізацыйная.

Гэтыя сэкцыі ўжо прыступілі да працы. У пачатку красавіка Віцебскае акруговае аддзяленьне Аўтадору адчыняе ў Віцебску курсы дарожных майстроў. Апроч гэтага, насланы 2 чал. з нашай акругі ў Менск на аўта-трактарныя курсы.

За нядбайныя адносіны.

(Ад нашага ўласнага карэспандэнта).

ВІЦЕБСК, 29-3. Зволены з працы за нядбайныя адносіны да хлебазагатоўчае кампаніі загадчыкі фінчасткі Віцебскага і Езярышчанскага райвыканкомаў, а таксама старшыня РВК Лёзна Гаравец, згодна пастановы акрвыканкому.

5-цігадовы юбілей пастаноўкі „Кастусь Каліноўскі".

МАГІЛЕЎ, 28-3. 8-га красавіка БДТ1 спраўляе 5-цігадовы юбілей і 100 пастаноўкі п'есы „Кастусь Каліноўскі".

Гэты юбілей мае асаблівае значэньне яшчэ і таму, што ўвесь ансамбль артыстаў, якія выступаюць у гэтай п'есе, нязьменна іграюць у працягу ўсіх 100 пастановак.

Сьвяткаваньне будзе насіць урачысты характар.

90 ТЫСЯЧ НА ШКОЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА.

ГОМЕЛЬ, 28-3. На школьнае будаўніцтва і на капітальны рамонт школ у сельскіх мясцовасьцях адпускаецца 90 тысяч рублёў. З іх на новае школьнае будаўніцтва—72 тысячы, на капітальны рамонт—18 тыс.

ВІНАВАТЫ НЯДБАЙНАСЬЦЬ.

Ворша, 27-III. З пачатку кампаніі нізавая сетка сельска-гаспадарчай крэдытнай каапэрацыі ўзялася за рэалізацыю сялянскай пазыкі. 20 таварыстваў заключылі дагаворы з адпаведнымі райвыканкомамі ў тым, што яны бярудца рэалізаваць пазыкі на 19725 р. Тэрмін рэалізацыі ўжо хутка канчаецца, а наша с.-гасп. каапэрацыя пакуль што рэалізавала пазыкі ўсяго на 3785 руб. Толькі нядбайныя адносіны вінаваты ў тым, што нашы нізавыя працаўнікі ня выканалі свайго догавару.

ПАБУДОВА ГРАМАДЗКІХ ЛАЗЬНЯЎ У РАЙЁНАХ.

ВІЦЕБСК, 28-III. Прэзыдыум АВК прызнаў мэтазгодным пабудаваць грамадзкія лазьні ва ўсіх райёнах, за выключэньнем Лёзьненскага і Высачанскага. у якіх хутарское землякарыстаньне. У Сеньненскім і Чашніцкім райёнах будзе пабудавана па 2 лазьні, у астатніх—па адной.

Асыгнавана па 250 руб. на кожную лазьню, астатнія на 500 руб. аднесены за кошт самога насельніцтва.

КУРСЫ ДАРОЖНЫХ МАЙСТРОЎ.

Гомель, 28-III. Праўленьне Аўтадору парашыла арганізаваць курсы дарожных майстраў. Заняткі на курсах мяркуецца распачаць у сярэдніх лічбах мая з тым, каб пасьля чатырохтыдневых практычных заняткаў курсанты змаглі 3-4 летнія месяцы прайсьці практычныя работы на будаўнічых вучастках, а з восені на працягу двух месяцаў закончыць тэарэтычны курс.

Курсы разьлічаны на 21 чал.

У час заняткаў курсанты будуць атрымоўваць ад 20 да 30 рублёў стыпэндыі.

Рэалізацыя пазыкі ў Аршанскай акрузе.

(На пасяджэньні цэнтр. камісіі садзейнічаньня рэалізацыі пазыкі).

Цэнтральная камісія садзейнічаньня рэалізацыі пазыкі на пасяджэньні 28 сакавіка заслухала даклад представніка Аршанскай акруговай камісіі аб ходзе рэалізацыі пазыкі ў акрузе.

Аршанская округа атрымала заданьне рэалізаваць сялянскай пазыкі на 368 тыс. руб. Да 26 сакавіка ў акрузе рэалізавана пазыкі на 94 тыс. руб., што складае 25 проц. заданьня. Галоўная маса пазыкі распаўсюджвана сярод сялянства, дзе рэалізавана 84784 руб. ці 23 проц. Рэшта—9 тыс. руб. рэалізавана ў гарадох, з якіх каля 7000 р.—сярод вайсковых чыноўнікаў.

З паасобных райёнаў на першым месцы ў справе рэалізацыі пазыкі ідзе Багушэўскі райён, які рэалізаваў каля 50 проц. заданьня, на апошнім месцы — Ляднянскі райён, дзе рэалізав. пазыкі толькі каля 9 пр. З паасобных арганізацый вельмі мала рэалізавалі к-ты сялянскай узаемадапамогі і аддзяленьне Белсельбанку: апошняе прадало пазыкі ўсяго за 45 р.

Слабы тэмп рэалізацыі сялянскай пазыкі дакладчык тлумачыць тым, што ў межах Аршанскай акругі няма самастойных лесараспрацовак, якія маглі-б даць значны заработак сялянству. Аднак, дакладчык мае надзею, што ў бліжэйшыя часы ў акрузе кампанія рэалізацыі сялянскай пазыкі разгорнецца больш актыўна.

Прыкладная праца камсамолу.

ПЕТРЫКАЎ, 22-3. (Ад уласнага кар-та). Усе камсамольскія ячэйкі Петрыкаўскага райёну грунтуюцца на абгаварылі пытаньні загатоўкі і распаўсюджваньня пазыкі. Акрамя сялянскай гаспадаркі, камсамольцы першыя ўнесьлі сваю хоўку, а пазыкі рэалізавалі на суму 1300 рублёў.

Перад вясеньняй сяўбой.

Полацкая округа перад сяўбой.

Ачыстка насеньня ў акрузе праходзіць даволі слаба з тае прычыны, што ўсяго ёсьць 18 трыераў. Заказы Цэнтраземскладу на 20 трыераў да гэтага часу ня выкананы ім, у выніку чаго каля 50 проц. насеньня ня будзе ачышчана.

Пасяўны пляц сёлета мае быць павялічан на 5 тысяч дзесяцін, пасевы канюшыны будуць павялічаны на 33 проц., лёну на 10 проц., бульбы на 3,9 проц.

Сёлета будзе праведзена значная праца ў галіне ўзмацненьня калектыўных і каапэрацыйных элемэнтаў у сельскай гаспадарцы. Мае быць арганізавана 27 сельска-гаспадарчых арцелей, 18 таварыстваў па супольнай апрацоўцы зямлі, 100 машынных таварыстваў, 9 насеннаводных, 9 малочных, 3 па нташнідзтву, 45 садова-гародных і 5 пасёлкаў-каапэратываў.

У акрузе адчуваецца недахват звычайнага і сартавога аўсу, ячменю і лубіну. Адсутнасьць сартавога аўсу зрывае ўсю падрыхтоўчую працу па арганізацыі насеннаводных таварыстваў. Мерапрыёмствы па ільнаводзтву праводзяцца даволі актыўна, але Цэнтраземсклад ня выслаў 4 ільнатрашчоткі, што затрымоўвае ачыстку насеньня лёну. Сёлета праведзена кантрактацыя на 5.500 гэктараў лёну і на гэту справу выдана крэдыту 140 тысяч р.

Урэшце трэба заўважыць, што Цэнтраземсклад таксама ня выканаў заказаў на садова-гародныя прылады, што значна паслабіць кампанію па барацьбе з садовымі шкоднікамі.

У Аршанскай акрузе не хапае насеньня.

У межы акругі завезена ўсяго 25 проц. аўсу, што падлягае да завозу, 74 проц. ячменю, 37 проц. цімафейкі, 11 проц. вікі, 10 проц. сэрадэлі, 50 проц. лёну-даўганцу, лубіну зусім няма. З с.-г. машын вельмі мала завезена трыераў, у якіх адчуваецца вялікая патрэба.

У справе падрыхтоўкі да пасеўнай кампаніі малы ўдзел прымаюць РВК, КСУ і інш. арганізацыі, якія павінны [illegible] справе прымаць больш [illegible]. Можна заў[illegible] коль[illegible]

ЦКК-РСІ аб падрыхтоўцы да пасеўнай кампаніі.

29 га сакавіка на аб'яднаным пасяджэньні прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б і калегіі НК РСІ тав. Вілінстовіч зрабіў інфармацыю аб падрыхтоўцы да вясеньняй пасеўнай кампаніі, дзе адзначыў недахваты ў працы цэнтральных устаноў у падрыхтоўцы да кампаніі. Тав. Вілінстовіч заўважыў, што зараз трэба прыступіць да праверкі выкананьня дырэктыў на месцах па пытаньнях пасеўнай кампаніі.

На гэтым пасяджэньні была прынята пастанова, у якой адзначаюцца выпадкі спазьненьня падачы акругамі заявак на насенныя матар'ялы. Некаторыя акругі спазьніліся на 2—3 месяцы, а Менская і Мазырская акругі зусім ня далі вестак. Далей у рэзалюцыі адзначаецца ход загатовак насеньня. Лічбы паказваюць наступнае: канюшыны загатоўлена—109 проц., лубіну—6 проц., аўсу—76 проц. Камітэты сялянскай узаемадапамогі выканалі толькі 35 проц. заданьня.

НК РСІ даручыў Наркамзему, Белсельсаюзу і Белсельтрэсту ўзмацніць ход ачысткі насеньня. Акрамя гэтага, адзначана спазьненьне ў выкананьні заявак на трыеры.

Па лініі Наркамзему і НК РСІ ў паасобныя акругі пасылаюцца працаўніні для дапамогі і праверкі ходу пасеўнай кампаніі.

АКК РСІ даручана праверыць прычыны спазьненьня заявак і вінаватых прыцягнуць да адказнасьці.

ТЭЛЕГРАМА НК РСІ СССР.

Намесьнік Народнага Камісара РСІ БССР тав. Віленстовіч адправіў наступную тэлеграму на імя Наркома РСІ СССР тав. Арджанікідзе аб ходзе пасеўнай кампаніі:

Завоз аўсу зацьверджаны плянам паступае слаба. Да 27 сакавіка адгружана: Хлебапрадуктам—66 проц., Хлебацэнтрам—34 проц., Цэнтрасаюзам—6 проц. Зусім малая колькасьць адгружана Хімсындыкатам угнаеньня, прадугледжанага плянам—суперфасфату 79 проц., фасфарыту 18 проц., калійнай солі 55 проц., а тамасшлак, амоні зусім не адгружаны. Трыераў паступіла 18 проц., прадугледжаных па плану, савгаспадарні выключаны з забесьпячэньня ўгнаеньнем „Госсельсиндикатом". Прашу прыняць меры да завозу аўсу і ўгнаеньня да 1 красавіка, як гэта прадугледжана дагаворамі. Неадгрузка трыераў да пачатку красавіка сарве насенна-ачышчальную кампанію. Хадайнічаю аб уключэньні Белсельтрэсту ў вясеньні план па забесьпячэньню ўгнаеньнем з боку „Госсельсиндиката".

Дасягненьні і недахваты ў падрыхтоўцы да сяўбы.

(З пасяджэньня сэсіі Савету Белсельсаюзу).

Даклад аб падрыхтоўцы да вясеньняй пасяўной кампаніі выклікаў з боку ўдзельнікаў жвавыя спрэчкі.

Папершае, аб самой падрыхтоўцы Белсельсаюзу. Новага да таго, што ў нас друкавалася, дакладчык нічога не сказаў,—загатоўлена шмат сельска-гаспадарчых машын і прыладаў,—у вогуле плян загатовак выкананы на 85-100 проц. Вялікі недахват малочнага інвэнтару, ня хопіць трыераў і пружынных барон. Штучнага ўгнаеньня загатоўлена да вясеньняга севу таксама амаль што ня ўсе 100 проц. З загатоўкай насеньня траў таксама справа абстаіць больш-менш здавальняюча, за выключэньнем лубіну. Зернавых культур загатоўлена—ячменю 150 проц. заданьня, аўса—132.000 пуд. Кепска справа з завозным аўсом—ён паступае вельмі слаба, ды і не кандыцыйнай якасьці.

У КАГО-Ж ПРАВІЛЬНЫЯ ЛІЧБЫ?

Балючае пытаньне амаль што ўсіх [illegible]наўшых у спрэчках,—гэта кан[illegible]ныя. Тав. Хойніч кажа, што ў [illegible]ваньня ня ўсё добра, бо [illegible] няправільных лічбах: [illegible]чбы, Статбюро—свае, [illegible] каго плошча насе[illegible] каго зьменшана. [illegible] парадак.

[illegible] таварышоў [illegible] спра[illegible]

Прадстаўнік Аршаншчыны, а таксама і Меншчыны адзначылі, што становішча з падрыхтоўкай да пасеўнай кампаніі ў нас ня зусім добра: авёс завозіцца слаба. Менская округа зрабіла заяўку на 110.000 пуд. аўса, а адпускаюць толькі 35.000 пуд.

МАЛОЧНАГА ІНВЭНТАРУ НЯМА.

Пытаньне з забесьпячэньнем малочным інвэнтаром стаіць вельмі востра; нас абвінавачваюць, што мы далі позна зяўкі, але Ворша дала іх 5 з пал. месяцаў таму назад і ўсё роўна не дапамагло.

— Мы маем на ўвазе сёлета давесьці лік малочных аб'яднаньняў да 100 і даць па 1.000 руб. кожнаму на інвэнтар, але апошні няма дзе набыць,—кажа прадстаўнік Меншчыны. Трэба прыняць меры, каб гэту недарэчнасьць зьнішчыць.

— Аршаншчына чакала атрымаць 5 трактараў, іх у Белсельсаюзе чамусь-та няма, а Цэнтраземсклад іх мае.

З АЧЫСТКАЙ НАСЕНЬНЯ СПРАВА КЕПСКА.

Як дакладчык, так і выступаўшыя прамоўцы адзначалі, што справа з ачысткай насеньня стаіць з рук вон кепска. Той інвэнтар, які маецца, не нагружаны поўнасьцю, а ёсьць выпадкі, калі машына і абозы стаяць бяз працы.

НЕДАХВАТЫ Ў КАНТРАКТАЦЫІ ЛЁНУ.

Шмат месца ў спрэчках адводзілася пытаньню кантракцыі лёну.

— Летась быў дапушчаны цэлы [illegible]раг памылак пры праведзеньні кан[illegible]тацыі,—галоўная з іх: грошы раз[illegible]не таму, хто сее лён, а таму, [illegible] у вусім ня селу. Пасьля засе[illegible]водзілася праверка кантрак[illegible] выпадкі, калі селяніна [illegible] 4 дзес., а сродкаў да[illegible]-ж ён засяваў [illegible]тацыі

Завоз насеньня і машын.

Да 20 сакавіка Белсельсаюз і Цэнтраземсклад завезьлі ў БССР: 591,424 тон насеньня канюшыны (109,2 пр. заданьня), 47,713 тон цімафейкі (54,2 проц.), 170,654 тоны сэрадэлі (69,4 проц.), 1152,407 тон вікі (92,9 пр.), 95,538 тон лубіну (7,2 проц.).

Што-ж датычыцца насеньня аўсу і ячменю, то з-па замежаў БССР завезена: аўсу—1595 тон (24,4 проц. заданьня), ячменю—227 тон (46,4 пр. заданьня).

Праз с-г. каапэрацыю загатоўлена 3089 тон аўсу (68,7 проц. заданьня), 1004 тон ячменю (74,7 проц. заданьня).

З сельска-гаспадарчых машын [illegible]ваецца недахоп трыераў (завезена [illegible]кі 18 проц.), з мінэральных ўдобраньняў мала завезена тамасшлаку [illegible] проц.).

Вучоба перад сяўбой.

Мсьціслаў, 29-3. Скончылі [illegible]нія с-г. курсы ў райёне. Усяго [illegible]саў па Мсьціслаўскаму райёну ў [illegible]годзе праведзена: двое трохты[illegible] агульных, адны месячныя, адны тыднёвыя з паказальным харчава[illegible] малочнай жывёлы. Слухачоў пр[illegible] курсы прайшло: пастаянных 310 [illegible]раменных каля 150 чал..

За час курсаў у мясцох [illegible] дзеньня праверана якасьць сяк[illegible] насеннага матар'ялу, сяляне [illegible] назіраньне за прарашчвацелем; а[illegible] заваны два с-г. гурткі, адно мал[illegible] таварыства, праведзен конкурс н[illegible]шы хлеў, у выніку чаго ацэнле[illegible] асьветлена 20 хлявоў, зроблена [illegible]кіх кармушак, сабрана заяў на [illegible]канюшынага насеньня.

Канюшына ў гэтых вёсках [illegible] буде сеяцца ўпяршыню. Усе куры[illegible] водзіліся выключна ў земляўпа[illegible]ваных вёсках. Сяляне тых вёсак [illegible] праводзіліся курсы, пачалі ўпер[illegible] сарціраваць насеньне.

Курсы паказалі надзвычайна [illegible] імкненьне сялян да сельска-гас[illegible]чых ведаў. Шэраг заяў ад сял[illegible] каб прыслалі агранома для [illegible] гаспадарчых гутарак, падкра[illegible] гэта і сьведчыць аб недастатко[illegible] колькасьці аграпрацаўнікоў у р[illegible]

Каго вінаваціць

Нізавая каапэрацыйная сетка [illegible]цебскай акругі атрымоўвае насеньне вікі праз акруговы сельсаюз транзітным парадкам. У двух райёнах, Міжанскім і Гарадоцкім, атрыманая вікі мае пяску і пылу каля 20 проц. Бясспрэчна, што ў гэтай справе мае месца наўмыснае злачынства. Насеньне аўса мае значна ніжэйшую кандыцыю і таксама засьмечана, што ў сувязі з ачысткай насеньня памяншае агульную колькасьць пасяўнога матар'ялу.

Бракуе насеньня.

Ворша, 22-3. У [illegible] можна заўважыць слабе[illegible] насеньня [illegible]

В. Кнорын.

АБ РАШАЮЧЫХ „ДРОБЯЗЯХ“ У ВЯЛІКІМ ПЫТАНЬНІ.

(Да пытаньня аб палітыцы беларусізацыі).

Мы самым радыкальным чынам вырашылі нацыянальнае пытаньне тым, што Кастрычнікавай рэвалюцыяй скасавалі панаваньне аднэй клясы над другой, аднэй нацыі над другой. Пасьля Кастрычнікавае рэвалюцыі, пасьля выгнаньня з нашае краіны Радзівілаў і Чапскіх, Ракаўшчыкаў і Полякаў, Скірмунтаў і Вайніловічаў, польскіх паменчыкаў і яўрэйскіх банкіраў, расейскіх чыноўнікаў і іх беларускіх падпалімаў, гвалтаўнікоў-русіфікатараў і гвалтаўнікоў-палёнізатараў,—перад намі ў галіне нацыянальнага пытаньня засталася толькі адна задача—будаўніцтва нацыянальнай беларускай культуры, як часткі новай сусьветнай сацыялістычнай культуры, пралетарскай па зьместу і нацыянальнай па форме. Цяпер просты рост культуры і цывілізацыі, прамысловасьці і тэхнікі, пісьменнасьці і школы, тэатру і літаратуры, на агульным фоне сацыялізму ў нашай краіне ёсьць тое асноўнае і рашаючае, што нам яшчэ патрэбна ў справе нацыянальнага будаўніцтва, у справе ўстанаўленьня фактычнае роўнасьці народаў, у справе поўнага выкананьня нацыянальнай праграмы эпохі сацыялістычнага будаўніцтва.

I. Праблема гораду і вёскі і нацыянальнае пытаньне.

Для таго, каб [зразумець некаторыя асаблівасьці шляхоў вырашэньня гэтых простых задач, мы не павінны выпусьціць з-пад увагі таго, што Кастрычнікавая рэвалюцыя застала Беларусь у пэрыядзе яшчэ незакончанага буржуазна-дэмакратычнага нацыянальнага адраджэньня, у пэрыядзе, калі толькі што пачалося выдзяленьне беларускай буржуазна-дэмакратычнай інтэлігенцыі з верхніх пластоў сялянства, калі толькі што пачаўся напыў у горад беларускіх рабочых, якія выкідаліся з вёскі, дзякуючы яе расслаеньню, калі яшчэ нацыянальна не аформілася беларуская гарадзкая буржуазея, калі рабочая кляса Беларусі па сваім нацыянальным складзе ня была яшчэ беларускай, калі культурны ўзровень працоўных мас беларускага народу, пераважна сялянскага, яшчэ быў вельмі нізкі, калі ня было самага элемэнтарнага першапачатковага культурнага накапленьня. Іншымі словамі, мы к моманту Кастрычнікавай рэвалюцыі ў Беларусі мелі становішча шмат у чым падобнае на становішча ў Чэхіі, аб якім пісаў Фр. Энгельс.

У 1852 г., у кнізе «Рэвалюцыя і контр-рэвалюцыя ў Нямеччыне», Фр. Энгельс пісаў:

«Тут у кожнай акрузе перамешаны дзьве нацыянальасьці; гарады наогул зьяўляюцца больш або менш нямецкімі, між тым, як у вёсках пераважае славянскі элемэнт, хоць і тут ён паступова разлагаецца і адціхаецца, дзякуючы сталаму ўзмацненьню немцаў; і далей:

«Славяне, асабліва заходнія—палякі, чэхі—гэта пераважна род земляробаў; гандаль і прамысловасьць амоль ня мелі ў іх асаблівага значэньня. Дзякуючы гэтаму, з ростам насельніцтва і ўзьнікненьнем гарадоў вытворчасьць усіх прамысловых вырабаў перайшла ў гэтых краінах у рукі нямецкіх імігрантаў, а абмен прамысловых прадуктаў на земляробчыя зрабіўся вылючнай манаполіяй яўрэяў, якія, такім чынам, наогул належаць да якой-небудзь нацыянальнасьці, у гэтых краінах зьяўляюцца больш немцамі, чым самі».

Такое становішча, з некаторымі вагаваньні ў адносінах да памянёных нацыянальнасьцяў, было гадоў 50-70 назад характэрна для цэлага шэрагу краін: Славакіі, Харватыі, Латвіі, Эстоніі, Фінляндыі і г. д., дзе вёска і горад рэзка адзначаліся па сваім нацыянальным складзе, дзе вельмі часта каранное вясковае насельніцтва было нацыянальна неаформлена або слаба афармлена (у старадаўніх выданьнях, напрыклад, латышы і эсты фігуруюць, як «undeitsche» —ня-немцы—„тутэйшыя“). Беларусы ў такім становішчы знаходзіліся аж да 1917 году. Нацыянальнае зьліваньне гораду і вёскі, пралетарыяту і сялянства ў Беларусі да рэвалюцыі не магло наладзіцца, бо працэс росту прамысловасьці ў Беларусі быў настолькі слабы, што на моц паглынуць пачат тай рабочай сілы, якая выкідвалася з прычыны разлажэньня гарадзкой яўрэйскай дробнай буржуазеі, што прыводзіла да масавай эміграцыі яўрэйскае беднаты ў Амэрыку. Лішняя рабочая рукі беларускай сялянскай беднаты, што выкідвала вёска, з прычыны такога слабога росту прамысловасьці, не знаходзіла сабе прыстасаваньня ў гарадох Беларусі, а павінна было шукаць работы за межамі Беларусі, у буйных прамысловых цэнтрах Расеі—у Ленінградзе, Рызе, Данбасе і ў эміграцыі—у Амэрыцы, Прусіі і г. д. Гэты слабы рост прамысловасьці да Кастрычнікавае рэвалюцыі перашкаджаў стварэньню беларускіх пралетарскіх кадраў. З другога боку, гэты-ж фактар перашкаджаў росту беларускай гарадзкой буржуазеі і затрымліваў рост і афармленьне беларускай буржуазна-нацыянальнай культуры. Такім чынам, Беларусь заставалася захудалай аграрнай правінцыяй, у якой гарады адыгрывалі пераважна ўсё яшчэ ролю абменных пунктаў са слабымі зачаткамі мясцовай прамысловасьці. Дзякуючы гэтаму працэс „беларусізацыі“ папуючых клясаў «сьвятлейшых» і «шляхетнейшых» Вайніловічаў і Скірмунтаў і іх буржуазных калег, якія пачынаюць усьвядамляць свае «нацыянальныя» інтарэсы і сваё пераважнае «права» на эксплёатацыю беларускіх рабочых, толькі што намячаўся. Значыцца, беларусы да рэвалюцыі яшчэ не змаглі афарміцца, як сучасная буржуазная нацыя, і перажывалі толькі працэс такога афармленьня, знаходзіліся на ступені буржуазна-дэмакратычнага нацыянальнага «адраджэньня»—самавызначэньня.

Паколькі сацыялістычная рэвалюцыя застала беларускі народ яшчэ ў пэрыядзе свайго буржуазна-дэмакратычнага нацыянальнага «адраджэньня»—самавызначэньня, паколькі нацыянальна-вызваленчыя задачы гэтага пэрыяду яшчэ ня былі выкананы, пралетарыят павінен быў узяць на сябе задачу давесьці да канца ўсе сапраўды рэвалюцыйна-дэмакратычныя задачы «адраджэнчага» пэрыяду, адкінуўшы ў бок тых насіцеляў гэтага «адраджэньня», якія ўжо да рэвалюцыі пасьпелі стаць рэакцыйнымі і, выкарыстоўваючы для практычнай работы ў галіне будаўніцтва нацыянальнае культуры тых «адраджэнцаў», якія зразумелі, або пачынаюць разумець, што, спазьніўшыся з выхадам на сцэну гісторыі, адсталая нацыя ў пэрыядзе вострых клясавых канфліктаў, у пэрыяд міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі можа сапраўды самавызначыцца і адрадзіцца толькі зьвязаўшы свой лёс з адзінай рэвалюцыйнай клясай—пралетарыятам і вырашаючы свае нацыянальныя задачы папутна з задачамі сацыялістычнай рэвалюцыі. Між іншым, толькі рэдкія адзінкі з былых «адраджэнцаў» маглі ўсьвядоміць і пайсьці цалкам за задачамі сацыялістычнай рэвалюцыі. На іх ужо вісеў значны груз буржуазнае рэакцыі. Асноўная група іх падзялялася на дзьве часткі: 1) тых, хто ўжо поўнасьцю зьвязаў свой лёс з буржуазеяй,—тыя разам з ёю пайшлі ў эміграцыю, і 2) тых, хто, будучы зьвязан з дробнай буржуазеяй гораду і вёскі, мог парваць некаторую частку сваіх буржуазных сувязяў, каб з агаворкамі вярнуцца для работы ў Савецкай Беларусі, створаной рабочымі і сялянамі, бачачы ў ёй завяршэньне сваіх нацыянальных (і толькі!) ідэалаў. Партыя міжнароднага пралетарыяту, такім чынам, стала завяршыцелем той часткі работы беларускага нацыянальнага «адраджэньня»-самавызначэньня, якая мела сапраўды рэвалюцыйна-дэмакратычны і нацыянальна-вызваленчы характар.

Сацыялістычная рэвалюцыя, якая адбылася ў краіне нацыянальна прыгнятаемай і якая знаходзіцца ў стадыі нацыянальнага адраджэньня, павінна была ня толькі зьнішчыць нацыянальны ўціск, але і ўзяць на сябе задачу па канчатковым афарміленьні нацый, выкінуўшы за борт контр-рэвалюцыйную буржуазею і намешчыкаў і іх інтэлігентных агентаў, узяць на сябе задачы па ліквідацыі нацыянальнага разрыву паміж горадам і вёскай і па арганізацыі першапачатковага культурнага накапленьня. Гэтыя задачы ўвайшлі, як сустаўная частка, у агульную праблему культурнае рэвалюцыі, вырашэньнем якой зараз занята партыя.

Праблема зблiжэньня гораду і вёскі, праблема культурна-эканамічная ў нашых умовах павінна быць пашырана яшчэ асобнай нацыянальнай часткай. Вырашэньне праблемы зблiжэньня гораду і вёскі ў гэтай нацыянальнай яе частцы ў Беларусі павінна ісьці двума шляхамі: па-першае, шляхам узмацненьня прыёму на фабрычна-заводзкія прадпрыёмствы новай рабочай сілы з беларускай беднаты, каб удзельная вага беларускага пралетарыяту ў прамысловасьці ўзьнімалася магчыма хутчэй, каб як мерамі фарсіраваньня індустрыялізацыі, так і мерамі ўзмацненьня прыёму беларускай рабочай сілы вырашыць гэту задачу хутчэй, чым яна магла-б вырашацца без сьвядомага ўзьдзейнічаньня; па-другое, павесьці работу па беларусізацыі ўжо занятых на бытворчасьці рабочых-беларусоў, якія ня ведаюць у выстарчальнай меры сваёй роднай мовы, з тым, каб яны магчыма хутчэй усьвядомілі беларускую ману ў мэтах узмацненьня ўплыву сацыялістычнага гораду на вёску. Ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту вырашэньне гэтай задачы, гэтай часткі праблемы набывае тым большую тэрміновасьць, што дыктатура пралетарыяту можа існаваць толькі апіраючыся на ўсю асноўную масу сялянства, толькі пры моцным саюзе пралетарыяту і вясковай беднаты з сярэднім сялянствам. Нацыянальны разрыў паміж горадам і вёскай, калі вёска гаворыць на адной мове, а горад на другой, азначае аслабленьне дыктатуры пралетарыяту. Працяг гэтага разрыву на будучае становіцца яшчэ больш небясьпечным для дыктатуры пралетарыяту таму, што ўзьвяцце культурнага ўзроўню сялянскіх мас, у зьвязку з праваднімай Савецкай уладай палітыкай, патрабуе значна большага ўзьдзейнічаньня словам, вусным і друкаваным, на вёску, патрабуе ўзмацненьня палітычнага кіраўніцтва і культурнага шэфства ў шырокім сэнсе слова гораду над вёскай. У той-жа час растуць патрэбнасьці вёскі ў вышэйшых формах культуры, якія могуць быць пралетарскімі па зьместу толькі пры наліччы выстарчальных пралетарскіх кадраў тэй нацыянальнасьці, на мове якой гэтыя формы стваракоўца. Калі ў момант Кастрычнікавае рэвалюцыі, пры вырашэньні задач палітыка-эканамічнага характару, пралетарскае кіраўніцтва беларускім сялянствам магло апірацца на ўплыван асноўных пралетарскіх цэнтраў Расеі, дык у будучай стадыі сацыялістычнага будаўніцтва, асабліва ў галіне культурнага будаўніцтва, гэта кіраўніцтва ўсё больш і больш павінна перайсьці ў рукі мясцовага беларускага пралетарыяту. У зьвязку з гэтым пытаньне аб росьце беларускіх пралетарскіх кадраў і аб беларусізацыі гэтых кадраў атрымлівае буйнейшае палітычнае значэньне.

(Працяг будзе).

Якое будаўніцтва сёлета будзе праведзена ў раёнах Менскай акругі.

Менскі акруговы выканаўчы камітэт канчаткова зацьвердзіў плян капітальнага будаўніцтва мясцовай прамысловасьці на 1927-28 год.

Згодна гэтага пляну, у раёнах Менскай акругі будуць праведзены наступныя работы.

ВУЗЬДЗЕНСКІ РАЙЁН.

На пераабсталяваньне Вузьдзенскай электрастанцыі адпушчана звыш 9.000 руб. і дадзена дынама-машына коштам каля 3.000 руб.

На заканчэньне пабудовы і абсталяваньне Закрэўскага млына вальцавымі прыладамі асигнавана 3.500 руб.

ПУХАВІЦКІ РАЙЁН.

На будаўніцтва ў Пухавіцкім раёне сёлета адпушана 8.480 руб. Гэта сума будзе выкарыстана на наступныя мерапрыёмствы: на пераабсталяваньне электрастанцыі ў Падбалоні — 2.940 руб., на абсталяваньне млына ў Падблоні — 2.715 руб. і на пабудову смалярнага заводу ў Таўкачэвічах —2.825 руб.

ЗАСЛАЎСКІ РАЙЁН.

Усяго па Заслаўскім раёне мае быць праведзена будаўніцтва на агульную суму 13.330 руб. Гэтыя сродкі будуць выкарыстаны на пабудову электрастанцыі і млына.

СМАЛЯВІЦКІ РАЙЁН.

У Смалявіцкім раёне сёлета мае будавацца бойня (3.900 руб.), электрастанцыя (4.989 руб.) і капітальны рамонт трох млынаў (5505 р.).

Усяго ў раёне будзе праведзена капітальнага будаўніцтва на суму звыш 14.000 руб.

КОЙДАНАЎСКІ РАЙЁН.

У Койданаўскім раёне сёлета будзе праведзена капітальнае будаўніцтва на агульную суму звыш 24.000 руб. Сродкі маюць быць выкарыстаны па ўстаноўку вальцаў у Койданаўскім камбінаце (7.640 руб.), на пабудову цагельні ў Дзягільне (2.910 руб.) і на пабудову заводу на апрацоўцы крэйды (12.000 руб.).

Да гэтых работ далучана яшчэ пабудова смалярні на суму 2.825 руб.

АВК запрапанаваў інспэкцыі мясцовай прамысловасьці зрабіць досьлех Койданаўскага і Лагойскага раёнаў і ўстанавіць, дзе в гэтых двох раёнаў карысьней пабудаваць завод для апрацоўкі крамянёў.

САМАХВАЛАЎСКІ РАЙЁН.

У Самахвалаўскім раёне сёлета мае будавацца цагельня. На гэту працу асигнавана 5.000 руб., прычым, сродкі будуць адпушчаны Камунальным банкам у выглядзе пазыкі.

ЧЭРВЕНСКІ РАЙЁН.

На пераабсталяваньне млына «Труды» асигнавана—5.000 руб., на пабудову цагельні—4.000 руб., на пабудову смалярні —2.825 руб. і на заканчэньне пабудовы млына ў Новазер'і—2.000 руб.

Усяго на будаўніцтва ў Чэрвенскім раёне асигнавана 13.800 руб.

СЬМІЛАВІЦКІ РАЙЁН.

У Забалацьні, Сьмілавіцкага раёну, сёлета мае будавацца вялікая цагельня. Пабудова не абыйдзецца ў 10.000 руб. Апроч гэтага, будзе зроблен рамонт мосту і млына ў м. Сьмілавічы на суму—2.000 руб. і пабудована смалярня (1.000 руб.).

АСТРАШЫЦКА-ГАРАДЗЕЦКІ РАЙЁН.

У Астрашыцка-Гарадзецкім раёне сёлета будзе пабудована вялікі крахмальны завод, на што асигнована 37.065 руб. Накрыцьцё гэтых расходаў 20.000 руб. паступіць з прамфонду, а рэшта сродкаў мае адпусьціць Камунальны банк (пазычка).

БАРЫСАЎСКІ РАЙЁН.

У Зембіне, Барысаўскага раёну, сёлета мае быць пераабсталёван млын. На гэту працу асигнавана 9.902 руб.

Па Барысаўскім гарадзкім камбінаце вызначана будаўніцтва на суму звыш 13.000 руб.

БЯРЭЗІНСКІ РАЙЁН.

На абсталяваньне заводу для вычыстки шпігінару асигнавана 6.000 руб., на абсталяваньне электрастанцыі—11.000 руб. і на пабудову 2 смалярняў—4500 р.

ПЛЕШЧАНІЦКІ РАЙЁН.

На пашырэньне электрастанцыі асигнавана 6902 р. і на ўстаноўку 1 гатара на лесапілцы—1000 р.

БЯГОМЛЬСКІ РАЙЁН.

У м. Бягомль сёлета будзе будавацца млын. На гэту працу асигнавана 7600 р. Апроч гэтага, другі млын мае быць пабудован у Бярэзіне на суму 7025 р.

У Грэскім раёне будзе пераабсталёван млын; на гэту працу асигнавана 4145 р.

КАПЫЛЬСКІ РАЙЁН.

У м. Капыль сёлета распачнецца пабудова вялікага камбінату. У камбінаце будзе абсталёвана электрастанцыя, вальцавы млын, вэўначоска і суконавалка. Пабудова гэтага камбінату будзе каштаваць 53000 р.

МЕНСЕЛЬПРОМ.

Капітальнае будаўніцтва па Менсельпрому сёлета будзе каштаваць 116039 р. Галоўныя работы наступныя: рамонт гідратэхнічнай станцыі ў Бандараўшчыне, пабудова полага шэрагу жылых дамоў і абораў у савецкіх гаспадарках, адваўленьне млына ў Лошыцы і інш.

ГАНДЛЁВА-БУДАЎНІЧЫ ТРЭСТ.

Па заводу «Мэтал» будуць праведзены работы на агульную суму 33652 р. На гэтыя сродкі пераважна будзе куплена абсталяваньне для розных майстэрняў і праведзены дробныя будаўнічыя работы.

Па цагельні № 2 будуць зроблены работы на суму 77645 р.

Па цагельні № 3 на абсталяваньне і на розныя дабудоўкі асигнавана 11369 р.

Па цагельні № 1—16930 р.

На заводзе „Усход“ і на кахляным заводзе будуць праведзены работы на агульную суму звыш 40000 р.

Усяго па Гандлёва-Будаўнічаму Трэсту —184440 р.

* * *

Агульная сума капітальнага будаўніцтва ў акрузе накуль што канчаткова ня высьветлена, бо да гэтага часу яшчэ не зацьвердзілі каштарыс на будаўніцтва на Менскім электрамашынабудным камбінаце, дзе сёлета маюць быць праведзены значныя будаўнічыя работы.

Што датычыцца падрыхтаванасьці да будаўнічага сезону і своячасовасьці яго пачатку, дык на мясцовай прамысловасьці ў гэтай справе ня ўсё добра. Будаўнічыя матар'ялы ёсьць, бо будаўніцтва, на сутнасьці, дробнае і кожнай арганізацыі непатрэбна вялікіх запатовак будаўнічых матар'ялаў. Рабочай сілай ня ўсе будаўнічыя арганізацыі забясьпечаны. Абсталяваньне для новых заводаў ёсьць толькі часткова.

У мясцовай, як і ў дзяржаўнай прамысловасьці, праекты пабудовак ня ўсюды падрыхтаваны.

Адным словам, будаўнічы сезон можа належным чынам разгарнуцца толькі ў пачатку мая. Аб пачатку будаўніцтва з 15 красавіка і гутаркі быць ня можа, бо ў гэты час яго могуць пачаць толькі некаторыя будаўнічыя арганізацыі.

Будаўніцтва на Бабруйшчыне.

Бабруйск, 27-3. Па акрузе распачата шырокая падрыхтоўка да новага будаўнічага сезону. Вопыт мінулагодняга будаўніцтва паказаў, што спазьненьне з падрыхтоўкай у значнай меры шкодзіць плянаваму выпаўненьню намечанага будаўніцтва. А на наступаючы будаўнічы сезон вызначаны грандыёзныя будаўнічыя работы. Гэтыя работы апэньваюцца ў 4 мілёны 585 тысяч рублёў.

Сюды належаць і будаўніцтва д яржаўнага і будаўніцтва мясцовага характару, прычым прамысловае будаўніцтва займее самую большую ўдзельную вагу ва ўсім будаўніцтве акругі на 1928 г.

Значнае, таксама, месца (16,3 проц.) займае школьнае будаўніцтва, шляхавае будаўніцтва і г. д.

Будаўнічыя працы дзяржаўнага значэньня апэньваюцца ў 2711 тысяч рублёў. Сюды ўваходзіць: пабудова ужо распачатага лесапрацоўчага камбінату ў Бабруйску (1068 т. р.), вайсковае будаўніцтва, пабудова крахмальнага заводу ў Чырвоным Бразе (300 тыс. руб.), пабудова жалезнабетоннага маста цераз раку Бярозу і г. д.

Будаўніцтва мясцовага характару апэньваецца ў 1873 тысячы рублёў. Маркуецца правесьці наступныя будаўнічыя работы: у г. Бабруйску пабудаваць два трохпавярховыя дамы на 60 кватэр, закончыць пракладку ваданаправодных труб. Па вясковаму будаўніцтву будуць праведзены наступныя работы: будзе пабудована 3 будынкі пад больніцы, адзін будынак пад агранамічны пункт, 29 будынкаў пад школы, крахмальны завод і г. д.

Улічваючы недахваты будаўніцтва мінулага году, арганізацыі, якія праводзяць будаўніцтва, шырока разгарнулі заготоўку, будаўнічых матар'ялаў зімою. Падвоз матар'ялаў да месца будаваньня зімою, заготоўка гэтых матар'ялаў зімою дала значную эканомію сродкаў супроць таго, калі-б гэтыя матар'ялы вогатаўліяліся ўлетку, у разгары будаўнічага сэзону.

З прычыны значнага спросу на такія матар'ялы, як дошкі, накост, сартавое жалеза, гэтых матар'ялаў не хапае ў патрэбнай колькасьці. Астаткімі будаўнічымі матар'ялямі акруга забясьпечана. Гэта дасьць магчымасьць своячасова і з посьпехам распачаць сяголетняе будаўніцтва.

А. Дэмброўскі.

Маленькі фэльетон.

ПРА ЧУЧАЛА І ПРА ЗУБРА.

Гэтымі днямі газэты паведамілі аб тым, што ў Інбелькульце паставілі чучала зубра, маючае вялікую навуковую каштоўнасьць.

Правільна!

Раз ужо чучала мае вялікую навуковую каштоўнасьць, знача яго трэба паставіць на відным месцы і шанаваць.

І каб ніякай «індэфэрэнтнасьці»,—з боку тых навуковых зубраў, чучалы якіх яшчэ рухаюцца.

Адным словам правільна!

Але, што, таварышы, рабіць з тымі чучаламі, якія ня маюць ніякай навуковай каштоўнасьці, прыносяць нам бязьмерную шкоду,—і, між тым, карыстаюцца абаронаю зубравых запаведнікаў.

Бо, як, таварышы, растлумачыць наступны факт.

Адзін з зубраў:

1) не прызнае нашага граматычнага і правапіснага палажэньня, якое прызналі мільёны БССР,

2) зьдзекуецца над нашаю мовай.

Я вас, таварышы, пытаюся, гэткае чучала мае для нас навуковую каштоўнасьць, ці не?

— Вось-то й яно.

А «яно» між тым «благополучно здравствует» на катэдры беларускага мовазнаўства і карыстаецца ўсяляк. падтрыманьнем.

Бо, ня гледзячы на тое, што:

1) навукова-метадалёгічны камітэт забараніў кнігу гэтага чучала,

2) 15 студэнтаў апошняга курсу падалі пісьмовую заяву аб тым, што вучоны мовазнаўца „спаволіць над беларускай мовай, парушаючы не ўсякія нормы“,

3) ня гледзячы на аналёгічныя заявы аўтарытэтнейшых мовазнаўцаў, «яно» прафэсарствуе і плодзіцца.

Болей таго. Яно яшчэ і «торжествует».

Болей таго. 15 студэнтам за іх пратэст у адпаведных інстанцыях ухвалілі: «поставить на вид».

Таварышы, зьвярнеце на гэты, мякка кажучы, недарэчны факт асаблівую ўвагу, бо Наркамасьветы ўсё роўна ня зьверне...

Таварышы, пасьля гэткіх гагентоцкіх пастаноў і гэткай зубравай недатычнасьці я адзеў кашулю на сьмерць і сеў пісаць гэты фэльетон пра чучала, якое стаўовіцца пудзілам.

Алёша.

БЕЛАРУСКІ СТУДЭНТ.

Дружней наперад!

ВЫНІКІ ЎСЕБЕЛАР. КАНФЭРЭНЦЫІ ПРАЛЕТАРСКАГА СТУДЭНЦТВА

Апошняя Ўсебеларская канфэрэнцыя пралетарскага студэнцтва завяршыла сабой вопыт і практыку паўтарагадовай працы студэнцкіх арганізацый.

Шмат месца ў працы канфэрэнцыі заняло пытаньне аб нежаданьні часткі студэнцтва па сканчэньні навуч. установы ехаць на вёску і імкненьні іх застацца нават на горшай працы, абы толькі ў горадзе. Гэткія імкненьні рашуча асуджаны.

Пытаньне далейшай пралетарызацыі навых навуч. установ, ня гледзячы на тое, што ў БССР у гэтых адносінах становішча лепшае, чым у іншых рэспубліках, таксама было рашуча высунута на канфэрэнцыі на дакладу Наркамасьветы. У гэтым годзе прынцыпна камплектаваньня будуць зьменены: у аснову кладзецца курыяльная сыстэма, вры якой будуць дадзены сталыя процанты кожнай сацыяльнай групе. Гэта мерапрыёмства, бязумоўна, будзе мець уплыў на пралетарызацыю нашых ВУЗ'аў.

У той час, калі мы ўжо даўваемся навыкі акадэмічнай пасьпяховасьці і пралетарызацыі навуч. устоноў, вельга не зьвярнуць самай сур'ёзнай увагі на матар'яльнае становішча нашага студэнцтва, бо ад гэтага ў значнай меры залежыць посьпех падрыхтоўкі новых спэцыялістаў. Канфэрэнцыя палкрэсьліла, што студ-ва да гэтага часу знаходзіцца ў вельмі цяжкім матар'яльным становішчы, ня гледзячы на некаторае палепшаньне гэтага становішча за апошнія гады; але было-б памылкай, калі-б гэтага палепшаньня мы чакалі выключна ад павялічэньня сродкаў на стыпэндыі, інтэрнаты, сталоўкі і г. д. Справа ў тым, што часта адпускаемыя сродкі скарыстоўваюцца нерацыянальна. Стыпэндыі выдаюцца нападаюць ня тым, каму трэба, настаноўка ў інтэрнатах часта дрэнная, бо мы не зьвяртаем належнай увагі на распорадак жыцьця ў агульных памяшканьнях, ня ставім своячасова перад кіруючымі органамі навуч. установ пытаньня аб хуткім мэрагу дробязяў, якія перашкаджаюць нармальнаму жыцьцю і г. д. Мы часта не аддаём належнай энэргіі тым пучасткам матар'яльна-бытавога жыцьця студэнтаў, дзе гэта энэргія магла-б выклікаць палепшаньне нашага дабрабыту і жыцьця. Усё гэта, вядома, ня здымае ні ў якім разе з павесткі дню пытаньня аб павялічэньні стыпэндый, аб пашырэньні інтэрнатаў і, наогул, аб палепшаньні матар'яльнага становішча студэнцтва.

Вакол усіх гэтых пытаньняў мы павінны найманней згуртаваць грамадзкую думку, якая дапамагла-б з наступнага навуч. году здабіцца агульнага палепшаньня, бо сёлета ня выдаецца ад падрыхтоўкі новых спэцыялістаў і аб утварэньні здавальняючых умоў для студэнцтва настойліва напамінае выпадак у Шахцінскім раёне.

Ня гледзячы на тое, што ў нас ОСО-Авіяхім значна пашырыў сваю працу, што ў нас ёсьць шэраг вайсковых гурткоў, аб сталяваны цірк,—усё-ж такі мы ня можам прызнаць, што посьпехі ў вапізацыі ў нас пагэтульні дастатковыя, каб мы маглі на гэтым супокоіцца. Нам патрэбна яшчэ больш падцягнуцца, яшчэ больш упягнуць масы ў працу вапізацыі з тым, каб у патрэбны момант мець магчымасьць абаранаць сацыялістычную бацькаўшчыну, абаранаць права на атрыманьне адукацыі, якое прынёс нам Кастрычнік.

В. Б-аў.

Наладзілі грамадзкую працу.

(Варанецкі сельска-гаспадарчы тэхнікум).

Тэхнікум знаходзіцца воддаль ад гораду і як па ўмовах агранамічнай працы, так і таўторыі больш зьвязан з вёскай. А таму і грамадзкая праца ў тэхнікуме набудавана так, каб найболей здаволіць патрэбы вёскі. Абслугоўвае тэхнікум грамадзкай працай Быччанскі сельсавет і вёску Селішча, Жыцькаўскага с.-с.

Пад кіраўніцтвам партыйнай ячэйкі ў сельсавеце праводзіцца праца з дэлегаткамі і беднатой.

У в. Бычча беднота арганізавана, як моцны асяродак для правядзеньня ў жыцьцё мерапрыёмстваў партыі і ўлады; вынёсшы бядняцкі актыў. І гэта ў тэй вёсцы, дзе раней гэтыя беднякі вечна «бузілі» на сходах.

Камсамольская ячэйка ў выніку сваёй шматгадовай працы арганізавала 2 вясковыя камсамольскія ячэйкі. Адна з іх—Маластахоўская—арганізавала ў камсамол усю лепшую моладзь вёскі, мае шмат узорных прыкладаў камсамольскай працы (правядзеньне сьвята Кастрычніка, арганізаваны дзявочых гурткоў кройкі, курсаў для падрыхтоўкі ў прафшколу і інш.) і зьяўляецца прызнаным кіраўніком жыцьця вёскі. Тэхнікумскія камсамольцы дапамагаюць гэтым ячэйкам у палітвучобе і іншай культ. працы і, акрамя таго, у вёсцы Селішчы (дзе няма ячэйкі) вядуць працу з вясковай моладзьдзю.

Старэйшымі курсамі вядзецца агранамічна-грамадзкая праца.

Дзеля гэтага ў 2-х вёсках праведзены сельска-гаспадарчыя курсы, у 3-й вёсцы арганізоўваецца паказальнае карміленьне кароў і вядзецца падрыхтоўка да весавой васеўнай кампаніі. На вясну на гэтай галіне намечана ўжо вялікая праца з краязнаўчым ухілам: вывучэньне севазвароту у раёне, вывучэньне арганізацыі малочных арцеляў, закладка досьледаў з мінеральнымі ўгнасьнямі і інш.

У гэтай працы ўдзельнічаюць з вялікай цікавасьцю ўсе студэнты старэйшых курсаў, як камсамольцы, так і беспартыйныя.

Разам з гэтым ёсьць і недахопы. Шырокая праца ў вёсцы стварае тое, што зусім мала аддаецца ўвага сваім тэхнікумскім пытаньням: рацыяналізацыі вучобнай працы, пытаньням свайго быту, гуртковай працы і інш. Мала зьвяртаецца ўвагі на культурнае абслугоўваньне рабочых тэхнікуму (праводзіцца толькі невялікая праца з жанчынамі). Мала ўвагі аддаецца рацыянальнай грамадзкай нагрузцы сярод пас і камсамольцаў, амаль зусім не ня моладзкай працы беспартыйнае і малодшых курсаў.

Не вымяншаючы размаху ны у вёсцы, неабходна зан нем рацыянальнай грам студэнта і аддаць больш тэхнікумскім пытаньня зазінны разьвязаць гра тэхнікуму.

ЗАВАЕВАНАЕ ПОЛЕ.

Сярод чыркаўскіх сялян, апранутых у белыя суконныя сьвіткі і абутых у вяровачныя лапці, сплеценыя ў сьлапую, ушчамілася каля 40 былых чорнарызьнікаў—манахаў. Аб гэтым добра ведаюць у Парыцкім раёне і ў Бабруйскай акрузе.

Але бачыць зялёнае, кіслае, як воцыт, яблыка—адно, а пасмакаваць яго, адчуць няпрыемнае ўзбудженьне ў роце, мімавольна зрабіць на твары няпрыемную міну—зусім другое.

У Чыркавічах як-бы «дзьве вайны і два сьвяты». З аднаго боку—верныя богу слугі, напрактыкаваныя чорнарызьнікі, царэўшчык «сноцы» ніжэйшага разраду, усё тое, што з абломаўскім гультайствам дажывае апошнія дзянькі —манахі; з другога —бадзёрае, маладое, як усходы на сонцы пасьля цёплага дажджу, энэргічнае, як добра ўдасканаленая машына, з жалезнай вытрымкай і сталёвай воляй—гэта сямейка камсамольцаў.

Два неўгамонныя ворагі. Усё тое, што так прыемна і дорага для маладых будаўнікоў, усё тое найпрыгажэйшае, што маюць у сваёй працы чыркаўскія камсамольцы—гарчай найгарчэйшай рэдзькі для манахаў.

... Пасеялі ярыну. Тыдні два бязьлітасна пячэ сонца. Патрэскалася зямля.

Манахі ходяць з хаты ў хату і, як бязвубыя старэнькія бабы, нашэптваюць:

— Яшчэ ня тое будзе. Пачакайце, людцы! Гэтыя антыхрысты даскачуцца да другога патопу...

Жніво. Людзі стараюцца за надворсі сабраць хлеб. А тут часам дождж пацярушыць і прагоніць жней з поля. Зноў з неба

— З пакон веку так ня было, каб у жніво праліўныя дажджы!—«аўтарытэтна» заяўляюць манахі.

І агітавалі чорнарызьнікі супроць камсамалят, як толькі ўмелі. Усе сродкі і мэтады паперапрабавалі, усе вясковыя „невзгоды“ скарысталі, а такі нічога—бязрэзультатна аказаліся. Камсамольцы сваімі невялічкімі гаспадарчымі мерапрыёмствамі з вялікім гэрэйствам адбівалі манахаўскія атакі.

Над бокам у Чыркавіч—гара. Пясок на ёй—сыпучы, сыпучы. У жмені ня ўтрымаеш: вадою выкоўзваецца. Разыгрываецца ў летнія сухія дні вецер—канца краю ня відаць з-за пясчаных хмараў! З хаты вылезьці нельга. Уся гародніна пакрыецца тоўстым сівым пластом пылу, і калі некалькі дзён падрад ня будзе дажджу—сьмела лічы, што капуста і агуркі прапалі.

Паставілі камсамольцы на сваім сходзе пытаньне аб «наступленьні пясчаных стыхій на мірную вёску». Абгаварылі. А ў чарговы сьвяточны дзень сабраліся ўсе, прывезьлі з другога месца нахапаных лазовых кустоў і да поўдню засадзілі ўсю гару.

Якраз пашанцавала—увечары быў дождж і ўсе кусты прыжылі.

Шмат мінулаў шырокіх лісьцікаў уважліва сьцерагуць сыпучыя пяскі. Ніякая віруха зараз ня вырве з пад іх ні жменькі зоўценькай зяхелькі. Чыркаўскай гародніне не пагражаюць хмары пылу.

Кожную вясну, калі пачынае сыгналізаваць сваімі залацістымі праменямі сонца, чыркаўскія камсамольцы бяруцца за абгаварэньне заданьняў па паленшаньню гаспадаркі для кожнага сябра яячэйкі.

[illegible] засеў лёну, другому—ня менш пяці гарпаў расьсеяць канопляў, трэцяму—закласьці паказальны вучастак з карняплодамі, чацьвертаму — перамяніць белую канюшыну на чырвоную і г. д. і г. д. Яшчэ сьнег не пасьпеў мутнымі раўчукамі зьбегчы з поля, як камсамольцы, навыперадкі адзін перад другім, старацца якнайлепш выканаць сваё заданьне.

Аднаго разу на пасяджэньне бюро камсамольскай ячэйкі прышоў белагаловы, плячысты камсамолец Андрушка. На яго твары сьвяцілася вялікая радасьць. Вочы расінкамі-капелькамі бегалі па хаце. Хлопцы пачалі дапытвацца.

— Наша карова ацялілася... Тая, што ганялі летась у савхоз. Цялушка галяндзкага гатунку,—адкрыў Андрэй перад хлопцамі прычыну свае радасьці.

Забегалі думкі ў галовах сяброў бюро.—«Як скарыстаць гэты факт?»—Тайком дуваў кожны пра сябе. Выказвалі многае. У пратакол запісалі: «Даць Андрэю заданьне выгадаваць цялё па ўсіх правілах жывёлагадоўлі».

Сходзіў хлапец да агранома, расказаў, параіўся, запісаў шмат што ў маленькі замусолены блёкнотык, а праз паўгода—цялё роўна з маткай.

Цяпер манахі прыціхлі. Калі стары гаспадар, ідучы з заняткаў сельска-гаспадарчага гуртка, які арганізавалі камсамольцы, спаткаецца на вуліцы з чорнарызьнікам і, хітра падмігнуўшы, скажа:

— Дай бог здароўя нашым камсамольцам. Гэта-ж яны н

АБ УТВАРЭНЬНІ ПАЛЯУНІЧАГА ЗАПАВЕДНІКА.

Пастанова Народнага Камісарыяту Земляробства БССР.

1928 г. сакавіка 27 дня. Народны Камісарыят Земляробства БССР., разважаючы ходайніцтва Беларускага Канвэрацыйна-Прамысловага Саюзу Паляўнічых ад 17 сакавіка 1928 г. за № 293, аб утварэньні паляўнічага запаведніка з мэтай оховы бабрoў у райёне быўшага маёнтку «Мураванка», Дрыбінскага райёну, а таксама пастанову аб гэтым Прэзыдыуму Аршанскага Акруговага Выканаўчага Камітэту, ад 12-VII 27 г., і паведамленьне Аршанскага АКРЗА, ад 23-VIII-27 г. за № 10304, пастанаўляе: утварыць паляўнічы запаведнік з забаронай палявання на ўсякую дзічыну і птушак і рыбную лоўлю тэрмінам на пяць гадоў ад гэтага дню ў райёне Трыдесінскай дачы Дрыбінскага лясніцтва. У межы гэтага запаведніка павінны ўвайсьці: 1) «Стау-Мураванка" забалочаная плошча між рачак Мураванкі і Шышаўкі і вур. «Габаліха» дзяржаўнага лясного фонду, плошчай каля 90 гэктараў;

2) Берэгавая паласа на абодвых берагох ракі Проні ад вёскі Галавіч да Заоскага млына з лясным вуроч. „Посава" плошчай каля 100 гэктараў.

Народны Камісар Земляробства Зьм. Прышчэпаў.

Загадчык Лясным Аддзелам В. Тиачоў.

Інспэктар па лесаэксплёатацыі Ждановіч.

Барацьба з бяспрытульнасьцю дзяцей.

(У ПРЭЗЫДЫУМЕ ЦЭНТРАЛЬНАЙ ДЗІЦЯЧАЙ КАМІСІІ).

24 сакавіка пад старшынствам тав. Чарвякова адбылося чарговае пасяджэньне Прэзыдыуму Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі, на якім заслухан даклад аб працы Менскага т-ва „Прыхільнік Дзяцей".

Выступаўшыя ў спрэчках т. т.—Бацкі, Крэмэр, Гэртмак, Вігдорчык, Будзін і т. Чарвякоў—адзначылі шэраг дасягненьняў у працы Менскага т-ва „Прыхільнік Дзяцей" і пашырэньне дзейнасьці т-ва.

Тав. Чарвякоў у сваёй прамове заначыў, што т-ва ў апошні час правяло здавальняючую працу па барацьбе з дзіцячай бяспрытульнасьцю. Галоўная задача Дзіцячых Камісій і т-ва «Прыхільнік Дзяцей»—барацьба з вулічнай бяспрытульнасьцю праводзеньнем мерапрыёмстваў па папярэджаньні бяспрытульнасьці (прафілактыка). Гэтую задачу і ставіла перад сабой Менскае т-ва „Прыхільнік Дзяцей".

Прамоўца падкрэсьлівае, што 5 руб., дадзеныя для дзіцяці беднай матцы або непасрэдна бездагляднаму дзіцяці, адыгрываюць вялікае значэньне, і пакуль што мы ад гэтага адмовіцца ня можам.

Тав. Чарвякоў кажа, што ў яго ёсьць думка пабудаваць у Менску цэнтральны дзіцячы клюб, у якім дзеці маглі-б разумна праводзіць час, але сродкі пакуль што не дазваляюць гэта зрабіць.

У далейшым працу па барацьбе з дзіцячай бяспрытульнасьцю неабходна пашырыць на вёсцы і на месцы аказваць дапамогу дзецям, а гэтага мы дасягнем удзячньнем у даную справу шырокай савецкай грамадзкасьці.

Вывучаем свой край.

Вывучэньне флёры Беларусі.

Прафэсар Беларускай С.-Г. Акадэміі Васільеў зараз сыстэматычна працуе над вывучэньнем флёры Беларусі. Праф. Васільеў сабраў багата матар'ялаў аб расьлінасьці паплавоў на р. Проні і правёў цэлы шэраг каштоўных фотафэнолёгічных назіраньняў.

Другі навуковы супрацоўнік акадэміі тав. Савельеў сабраў шмат матар'ялаў аб сьвяцьцевасьні культурных расьлін б. Калінінскай акругі. Апроч таго, т. Савельеў сабраў і апрацаваў да 1200 гэрбінаў да вышэйшай расьлінагадоўлі і дасьледчай справы.

Моладзь і сялянства—у краязнаўчыя арганізацыі.

Пядаўна закончылася ў Воршы 4-я акруговая краязнаўчая канфэрэнцыя, у якой прымала ўдзел каля 30 дэлегатаў. На канфэрэнцыі заслухана і справаздача ЦБ краязнаўства (даклад рабіў вамесьнік старшыні ЦБК т. Кізак), справаздача акруговага т-ва, даклад праф. Салаўёва аб фэнолёгічных назіраньнях і інш.

Канфэрэнцыя выявіла рост краязнаўчых арганізацый у Аршанчыне за кошт партыйнай, моладзі і сялянства.

Аршанскія краязнаўцы правялі значную працу у галіне вывучэньня багацьця акругі: торфу, охры, рознай гліны, узяты на вучот помнікі старажытнасьці, наладжана сувязь з саюзам паляўнічых і г. д.

Канфэрэнцыя ўхваліла зьвярнуць увагу краязнаўчых арганізацый на вывучэньне сучаснага руху да калектыўных форм сельскай гаспадаркі, што будзе мець вялікае значэньне для вынаўленьня агрэмаджаных элемэнтаў у сялянскай гаспадарцы.

Вывучэньне беларускіх лясоў.

Праф. Мельнік напісаў цэлы шэраг прац аб беларускіх лясох, гэтым галоўным багацьці нашай краіны. У працах праф. Мельніка ёсьць апісаньне паркавых парод расьлінасьці, фэнолёгічныя назіраньні над расьлінасьцю і інш. Усяго па гэтай справе выдана да 7 навуковых прац.

Прафэсар Пераход выпусьціў да 30 назваў розных прац, прысьвечаных, галоўным чынам, вывучэньню эканомікі лясоў БССР.

Карысныя выкапні на Беларусі.

Навуковы супрацоўнік Беларускай С.-Г. Акадэміі т. Кавалёў прымаў удзел у геолёгічных дасьледах паўночнай часткі БССР (на абшарах Віцебскай акругі); т. Кавалёў сабраў тут шмат карысных выкапняў.

Усяго ім сабрана да 300 розных узораў розных выкапняў і мінэралаў.

СУД.

ЗА РАСТРАТУ КААПЭРАЦЫЙНЫХ ГРОШАЙ.

Выязная сэсія Народнага Суду 8 вуч. Самахвалавіцкага райёну, Менскай акр., у в. Кайкава разгледзела крымінальную справу злоснага растратчыка каапэрацыйных грошай Лук'янчыка Максіма Бэнэдыктавага. Карыстаючыся грамадзкім давер'ем, Лук'янчык у жніўні 1926 г. уцёрся прыказчыкам у Бардзілаўс і каапэратыў, але грамадзкага давер'я не апраўдаў—пачаў рабіць растраты. Так, пры першай рэвізіі ў яго выяўлен недахоп 135 руб., пры другой—75 руб., пры трэцяй—214 руб., якія ён пакрыў часткай з пэнсіі, а часткай з гаспадаркі. У 1927 годзе ён павёў сваю „акцыю" шырэй: пачаў часта разьязджаць, а'нставаць, у выніку чаго пры апошняй рэвізіі ў краме выяўлена растрата ў суме 1389 руб. 04 кап.

Суд прыгаварыў Лук'янчыка Максіма на тры гады зьвяволеньня з пазбаўленьнем у... два гады па адбыцьці кары. ...чкі іск Бардзілаўскага спажы... ...а ў суме 1389 р. 04 к. Судом

Г. Г.

...Я ХРОНІКА.

...ишчык.

...ку Алесь Маркоўка ...г., недалёка ад Мен... ...ракце селяніна Ігнатові... ...ы фінскім нажом, адабраў ...ажух і боты.

Менскі акруговы суд прыгаварыў Алеся Маркоўку на тры гады зьвяволеньня з суровым адмежаваньнем, але на аснове амністыі скараціў пакаранье наполову.

Гвалтаўнік.

27 жніўня 1927 году гр. Смалявіцкага райёну Пётра Мархель, 18 гадоў ад роду, спаткаўшы ў лесе 11-гадовую дзяўчыну Алесю Розум, паваліў яе на зямлю і згвалтаваў. Менскі акр. суд прыгаварыў Пётра Мархеля на 6 гадоў зьняволеньня, але на аснове амністыі скараціў пакаранье да двух гадоў з суровым адмежаваньнем.

Чаму гэта так?

м. Крайск, 26-3. 18-га сакавіка ў м. Крайску адбыўся суд над 4-5 хлопцамі вёскі Рагозіна, якія ў часе вечарынкі ўчынілі бойку, пусьціўшы ў ход калы і нават нажы, адзін з іх быў паранен нажом; у чырвонаармей цаў, якія выпадкова праходзілі, ляцела з-за вугла кольле. Шмат разоў хуліганы гэтай вёскі рознымі спосабамі барыкадыравалі вуліцу, перашкаджаючы праяжджаць чырвонаармейцам.

Як ні даказваў начальнік №-й заставы ўсю шкадлівасьць такога хуліганства, але... суд апраўдаў абвінавачаных.

Чаму?! М.

НОВЫЯ КНІГІ.

Вышлі з друку і паступілі ў рэдакцыю газэты „Савецкая Беларусь" для рэцэнзіі наступныя кнігі Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва:

1. „Новым Шляхам" І. Гурскага. Стр. 54, цана 60 кап. (ц'еса ў трох дзеях).
2. «Што такое падземны агонь» П. Рубакіна. Стр. 120, цана 80 кап.
3. „Трыгономэтрыя" А. Круталевіча і А. Міцкевіча. Стр. 212, цана 2 руб. 25 кап. (Навукова-Мэтодолёгічным Камітэтам пры Наркамасьветы ўхвалена ў якасьці падсобніка для тэхнікумаў і агульна-адукацыйных курсаў).

Хроніка.

Рыхтуемся да аховы вёскі ад пажараў.

Народны Камісарыят Унутраных Спраў чыніць рыхтуецца да аховы вёскі ад пажараў.

Так, ужо атрымана і разьмеркавана 100 пажарных машын, якія ўжо разьмеркаваны па округах. У хуткім часе яшчэ будзе атрымана 230 пажарных машын. Апрача машын, выпісана 15.000 мэтраў пажарных рукавоў і іншыя прылады.

Сялянства арганізаваным парадкам купляе пажарныя машыны нараскхват.

Значнае палепшаньне ў пажарную ахову ўнясе самазабкладаньне, сродкі ад якога трэба добра разьмеркаваць і скарыстаць выключна на неадкладныя патрэбы вёскі, у прыватнасьці на пажарную ахову.

У канцы красавіка будзе склікана ўсебеларуская нарада пажарных працаўнікоў. Гэта нарада павінна будзе вызначыць канкрэтныя мерапрыёмствы па пажарнай ахове на летні час.

Маецца таксама на ўвазе правесьці конкурс на лепшую пажарную дружыну. Зараз па ўсёй БССР праводзіцца агляд прадпрыёмстваў і ўстаноў дзеля ўстанаўленьня, наколькі яны ажыцьцяўляюць супроць пажарныя мерапрыёмствы.

Пад суд за безгаспадарчую пабудову заводу.

Учора на пасяджэньні калегіі НК РСІ разглядалася справа аб ненармальнасьцях у пабудове скуранога заводу „Бальшавік". Матар'ялы абсьледваньня паказваюць, што пабудова заводу пачалася без зацьверджанага плану і праэкту. Апрача гэтага, кіраўніча-інжынэрны апарат не адпавядаў свайму прызначэньню. У выніку ўсяго гэтага адбылося безгаспадарчае будаўніцтва.

Калегія НК РСІ даручыла пракурору рэспублікі расьсьледаваць гэту справу і прыцягнуць вінаватых да судовай адказнасьці.

1-ы тыраж выйгрышаў па пазыцы ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі--у чэрвені сёл. г.

Першы тыраж выйгрышаў па пазыцы ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі перанесен з кастрычніка на ЧЭРВЕНЬ БЯГУЧАГА ГОДУ.

Збыт беларускіх тавараў на Сьвярдлоўскім кірмашы.

Упаўнаважаным Маскоўскай Канторы Белпайгандлю на Сьвярдлоўскім кірмашы заключыў дагавор з уральскімі арганізацыямі на пастаўку аношнаму лямпавага шкла на суму каля 50.000 р. Здача гэтага тавару павінна быць зроблена ў працягу часу з мая да верасьня.

Атрымана 10 трактараў з-за межаў.

Цэнтраземсклад атрымаў з-за межаў 10 трактараў, якія будуць разьмяркаваны паміж савецкімі гаспадаркамі і мэліярацыйнымі таварыствамі.

У хуткім часе Цэнтраземсклад мае атрымаць яшчэ 15 трактараў савецкага выробу.

Пабудова першага ў БССР дому інвалідаў працы.

Інжынэр Галоўнай Управы Сацыяльнага Страхаваньня БССР т. Сальмановіч распрацаваў праэкт першага ў Беларусі дому інвалідаў працы.

Дом гэты будзе пабудован у м. Былынкавічы, Магілёўскай акругі, у дачнай мясцовасьці.

У адным корпусе будзе 11 пакояў для жыльля, 2 пакоі пад майстэрні і шэраг іншых пакояў. У гэтым будынку будзе зьмешчана 60 мужчын-інвалідаў працы, а ў другім корпусе—30 жанчын. Уся пабудова абыйдзецца ў 17000 руб. і будзе скончана праз 2—2 з палов. месяцы.

Мэханізацыя Менскай шчотачнай фабрыкі.

На днях з Нямеччыны дастаўлена партыя машын для мэханізацыі шчотачнай фабрыкі ў Менску. З устанаўленьнем гэтых машын значна палепшыцца якасьць выпускаемай прадукцыі.

Разьвіцьцё пташніцтва.

Нар. Кам. Земляробства вядзе шырокую працу па разьвіцьці пташніцтва. Так, сёлета будзе ўтворана 60 новых пташніцкіх таварыстваў і 100 арцеляў на збыту яек.

ПАСЫЛКА СЯЛЯН НА КУРОРТЫ.

Інспэкцыя Аховы Здароўя Менскай акругі атрымала 18 месцаў на курортах спэцыяльна для сялян Мінчыны. Ужо 5 сялян атрымалі курортныя квіткі і гэтымі дня... выяжджаць на курорт у Лівадыю.

НОВЫ МЭТАД АДБОРУ НА КУРОРТЫ.

Галоўсакурстрах закупіў да 560 месц на курортах у Крыме і на Каўказе. Сёлета будзе практыкавацца новы мэтад адбору на курорты: будуць насылацца толькі тыя хворыя, якія знаходзіліся пад урачэбным наглядам і саправуды патрабуюць курортнага лячэньня.

60.000 РУБ. НА РАМОНТ ВЭТЭРЫНАРНАГА ІНСТЫТУТУ.

Нар. Кам. Асьветы адпусьціў Дзяржаўнаму Вэтэрынарнаму Інстытуту 60000 р. на ліквідацыю запазычанасьці на пабудове клінікі і на сканчэньне яе будаўніцтва. У надыходзячы будаўнічы сэзон клініка інстытуту будзе канчаткова пабудавана.

ВЕСНАВЫЯ КАНІКУЛЫ У ШКОЛАХ САЦВЫХУ.

У гарадзкіх, местачковых і вясковых сямёхгодных веснавыя канікулы адбудуцца з 29 красавіка да 6 мая. У пачатковых школах сацвыху веснавых канікул ня будзе, і вучэбны год скончыцца 1-га чэрвеня.

ДЗІЦЯЧЫЯ АЧАГІ І САДЫ БУДУЦЬ ПРАЦАВАЦЬ ЦЭЛЫ ГОД.

Да гэтага году ўсе дзіцячыя ачагі і сады БССР на час летняга адпачынку працаўзікоў зачыняліся. Сёлета ўпяршыню адпушчана 7.500 руб. на замену працаўнікоў дашкольных устаноў, галоўным чынам, дзіцячых ачагоў, на час летняга адпачынку. Такім чынам, нашыя дашкольныя ўстановы будуць працаваць без перапынку цэлы год.

ЛІТАРАТУРА ПА АЎТАДОРНАЙ СПРАВЕ.

Праўленьне Аўтадораў БССР супольна з Нар. Кам. Унутр. Спраў прыступіла да выданьня папулярнай брашуры «Сельскае дарожнае будаўніцтва». Брашура ўжо друкуецца і ў хуткім часе будзе разаслана на мейсцы.

Апроч гэтага, падрыхтоўваецца да выданьня брашура „Мэта і задачы Аўтадору". Гэта літаратура дапаможа ў працы курсаў і вясковых гурткоў па дарожным будаўніцтве.

ТРАКТАРЫСТЫ ДЛЯ САВЕЦКІХ ГАСПАДАРАК.

Стандартны камітэт Эканам. Нарады БССР адчыняе кароткa-тэрміновыя курсы для падрыхтоўкі трактарыстаў. На курсах будзе навучацца 30 чал., камандыраваных з савецкіх гаспадарак.

Культурныя навіны.

УТВАРЭНЬНЕ ПАДАРОЖНІЦКАЙ КАМІСІІ.

Нядаўна ўтворана падарожніцкая камісія, якая ставіць сваёй мэтай наладзіць далёкія экскурсіі па БССР. Самая далёкая экскурсія ў 800 кіл. мае свой маршрут—з поўна ы на ўсход і на поўдзень БССР. Маршрут падарожжа праходзіць праз шэраг буйных асяродкаў (Менск, Мазыр).

ЭТКАГРАФІЧНЫ ВЕЧАР.

Краязнаўчая арганізацыя Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту 16-га красавіка ладзіць вялікі этнаграфічны вечар, на якім будуць дэманстравацца музыка і сьпевы ўсіх нацыянальнасьцей, насяляючых БССР. На вечары будзе выступаць капэла Інбелкульту.

Апавяшчэньні.

— Сёньня, 30-га сакавіка, а 8 гадзіне ўвечары, у памяшканьні дзіцячага дыспансэру адбудзецца чарговае пасяджэньне пэдалёгічнай сэкцыі пры навукова-мэтадалёгічным камітэце НКА.

ПАВЕСТКА ДНЮ:

1. Выніні правядзеньня тэстаў Бінэ-Бэрта ў цэнтральнай дасьледчай школе. Дакл. д-р Эйнгорн.
2. Выніні масавага дасьледаваньня школьнікаў па тэстах Росоліка. Дакл. д-р Слуцкая.

Запрашаюцца пэдагогі, пэдалёгі і дактары.

— У нядзелю, 1 красавіка, а 12 гадзіню ў Доме Чырвонай арміі склікаецца нарада ўсіх кіраўнікоў вайсковых гурткоў Гарнізону. Яўка ўсіх кіраўнікоў абавязкова

ПЭДГАБІНЭТ.

— Сёньня, 30 сакавіка, а 8 гадзіне веч. асыстэнт БДУ МІЦКЕВІЧ прачытае даклад на тэму: „Элемэнты матэматыкі ў фізыцы".

— У суботу, 31 сакавіка, а 7 гадз. увечары—сход гуртка выкладчыкаў літаратуры і мовы.

Даклад Рубцова на тэму: „Літаратурныя гурткі ў школе".

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— Сёньня кіно: „Аня Гай". Сэансы ў 7 з пал. і 9 з пал. гадз. увеч. Карціну суправаждае музыка.

Законы і загады ўраду БССР.

ПАЛАЖЭНЬНЕ пра Цэнтральны Дом Селяніна БССР.

1. Цэнтральны Дом Селяніна БССР падпарадкаван Народнаму Камісарыяту Земляробства. Задачай Цэнтральнага Дому Селяніна зьяўляецца агранамічная, юрыдычная і іншая дапамога ўсім сялянам, якія беспасрэдна ці пісьмова вьвяртаюцца ў Дом Селяніна, і дача прытулку тым сялянам, якія прыяжджаюць у Менск па сваіх справах.

2. У складзе Цэнтральнага Дому Селяніна арганізуюцца часьці: а) культурна-асьветная, б) юрыдычна-кансультацыйная і в) адміністрацыйна-гаспадарчая.

3. Культурна-асьветная часьць наладжвае пры Доме Селяніна сельска - гаспадарчыя лекцыі, гутаркі, даклады, спэктаклі, бібліятэку-чытальню, выстаўку, музэй і кінематограф; дае агранамічную кансультацыю; кіруе экскурсіямі сялян на фабрыкі, заводы, шырокія рабочыя сходы, выстаўкі, музэі; дапамагае сялянам набываць літаратуру і г. д.

4. Юрыдычна-кансультацыйная часьць: а) дае розныя рады і даведкі сялянам-хадакам і адзіночкам па ўсіх праўных пытаньнях, датычных сялянскае гаспадаркі, у паасобку, па пытаньнях земляўпарадкаваньня, лясное гаспадаркі, падатковых, а таксама растлумачэньні юрыдычнага характару па пісьмовых пытаньнях сялян, б) дае заключэньні па ўсіх юрыдычных пытаньнях, узьніклых у дзейнасьці Цэнтральнага Дому Селяніна, абаранне інтарэсы Цэнтральнага Дому Селяніна ў судох і іншых установах.

5. Адміністрацыйна-гаспадарчая часьць абслугоўвае гаспадарчыя і фінансавыя патрэбы Цэнтральнага Дому Селяніна, вядзе падлік усяе маемасьці і нагляд за яе захаванасьцю, арганізуе і загадвае агульным памяшканьнем для прыяжджаючых сялян; вядзе перапіску Цэнтральнага Дому Селяніна, складае справаздачы аб яго працы, арганізуе ўзаемную сувязь і інфармацыю паміж Цэнтральным Домам Селяніна і мясцовымі дамамі селяніна, вывучае досьлед дамоў селяніна і распрацоўвае для іх інструкцыі, якія зацьвярджаюцца Народным Камісарыятам Земляробства.

6. Цэнтральны Дом Селяніна карыстаецца ўсімі правамі юрыдычнае асобы і мае права набываць і адчужаць усякага роду маемасьць, уваходзіць у абавязнасьці з дзяржаўнымі, грамадзкімі і прыватнымі ўстановамі, арганізацыямі і асобамі, прымаць маемасьць у дар, выдаваць даверанасьці, заўняць пратэзіі і адказваць на судзе.

7. Цэнтральны Дом Селяніна ўтрымоўваецца на сродкі, якія адпускаюцца яму па каштарысу Народнага Камісарыяту Земляробства.

8. Загадчык Цэнтральнага Дому Селяніна назначаецца Народным Камісарам Земляробства. Увесь іншы адказны пэрсанал зацьвярджаецца Народным Камісарам Земляробства па наданьні Загадчыка. Тэхнічны пэрсанал назначаецца Загадчыкам.

9. Загадчык Цэнтральнага Дому Селяніна зьяўляецца прадстаўніком Дому па ўсіх яго зносінах з дзяржаўнымі і грамадзкімі ўстановамі, арганізацыямі і прыватнымі асобамі, заключае ад імя Цэнтральнага Дому Селяніна дагаворы, выдае абавязваючыя і даверанасьці.

10. Цэнтральны Дом Селяніна знаходзіцца ў горадзе Менску і мае гэрбавую пячатку з надпісам «Цэнтральны Дом Селяніна БССР».

Старшыня СНК БССР М. Галадзед.
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР М. Мароз.

г. Менск. 23 сакавіка 1928 году.

ПОЛОЖЕНИЕ о Центр. Доме Крестьянина БССР.

1. Центральных Дом Крестьянина БССР подведомственен Народному Комиссариату Земледелия. Задачей Центрального Дома Крестьянина являются агрономическая, юридическая и другая помощь всем крестьянам, которые непосредственно или письменно обращаются в Дом Крестьянина, и дача приюта тем крестьянам, которые приезжают в Минск по своим делам.

2. В составе Центрального Дома Крестьянина организуются части: а) культ.-просветительная, б) юридическо-консультационная и в) административно-хозяйственная.

3. Культурно - просветительная часть устраивает при Доме Крестьянина сельско-хозяйственные лекции, беседы, доклады, спектакли, библиотеку-читальню, выставку, музей и кинематограф; ведет агрономическую консультацию; руководит экскурсиями крестьян на фабрики, заводы, широкие рабочие собрания, выставки, музей; помогает крестьянам приобретать литературу и т. д.

4. Юридическо-консультационная часть: а) дает разные советы и справки крестьянам-ходокам и одиночкам по всем правовым вопросам, касающимся крестьянского хозяйства, в частности, по вопросам землеустройства, лесного хозяйства, налоговым, а также разъяснения юридического характера по письменным запросам крестьян; б) дает заключения по всем юридическим вопросам, возникающим в деятельности Центрального Дома Крестьянина, защищает интересы Центрального Дома Крестьянина в судах и других учреждениях.

5. Административно-хозяйственная часть обслуживает хозяйственные и финансовые нужды Центрального Дома Крестьянина, ведет учет всего имущества и наблюдает за его сохранностью, организует и заведует общежитием для приезжающих крестьян, ведет переписку Центрального Дома Крестьянина, составляет отчеты о его работе, организует взаимную связь и информацию между Центральным Домом Крестьянина и местными домами крестьянина, изучает опыт домов крестьянина и разрабатываем для них инструкции, которые утверждаются Нар. Ком. Земледелия.

6. Центральный Дом Крестьянина пользуется всеми правами юридического лица и имеет право приобретать и отчуждать всякого рода имущество, вступать в обязательства с государственными, общественными и частными учреждениями, организациями и лицами, принимать имущество в дар, выдавать доверенности, заявлять претензии и отвечать на суде.

7. Центральный Дом Крестьянина содержится на средства, отпускаемые ему по смете Народного Комиссариата Земледелия.

8. Заведующий Центральным Домом Крестьянина назначается Народным Комиссаром Земледелия. Весь остальной ответственный персонал утверждается Народным Комиссаром Земледелия по представлению Заведующего, технический персонал назначается Заведующим.

9. Заведующий Центральным Домом Крестьянина является представителем Дома во всех его сношениях с государственными и общественными учреждениями, организациями и частными лицами, заключает от имени Центрального Дома Крестьянина договоры, выдает обязательства и доверенности.

10. Центральный Дом Крестьянина находится в городе Минске и имеет гербовую печать с надписью «Центральный Дом Крестьянина БССР».

Председатель СНК БССР Н. Голодед.
Управляющий Делами СНК и Экономического Совещания БССР М. Мороз.

г. Минск. 22 марта 1928 г.

ПАЛАЖЭНЬНЕ пра Акруговыя Дамы Селяніна.

1. Акруговыя дамы селяніна агранізуюцца акруговымі выканаўчымі камітэтамі і падпарадкаваны ім.

Задачай акруговых дамоў селяніна зьяўляецца агранамічная, юрыдычная і іншая дапамога ўсім сялянам, якія беспасрэдна ці пісьмова вьвяртаюцца ў дом селяніна, і дача прытулку тым сялянам, якія прыяжджаюць у акруговы горад па сваіх справах.

2. Акруговы дом селяніна наладжвае пры доме селяніна сельска-гаспадарчыя лекцыі, гутаркі, даклады, спэктаклі, бібліятэку-чытальню, выстаўку, музэй і кінематограф; дае агранамічную кансультацыю; кіруе экскурсіямі сялян на фабрыкі, заводы, шырокія рабочыя сходы, выстаўкі, музэі, дапамагае сялянам набываць літаратуру, дае розныя рады і даведкі сялянам-хадакам і адзіночкам па ўсіх праўных пытаньнях, датычных сялянскае гаспадаркі, у паасобку, па пытаньнях земляўпарадкаваньня, лясное гаспадаркі, падатковых, а таксама растлумачэньні юрыдычнага характару па пісьмовых пытаньнях сялян; устанаўляе ўзаемную сувязь і інфармацыю з Цэнтральным Домам Селяніна БССР і другімі акруговымі дамамі.

3. Акруговыя дамы селяніна карыстаюцца ўсімі правамі юрыдычнае асобы і маюць права набываць і адчужаць усякага роду маемасьць, уваходзіць у абавязнасьці з дзяржаўнымі, грамадзкімі і прыватнымі ўстановамі, арганізацыямі і асобамі, прымаць маемасьць у дар, выдаваць даверанасьці, заўняць пратэзіі і адказваць на судзе.

4. Акруговыя дамы селяніна знаходзяцца на акруговым бюджэце.

5. Загадчык акруговага дому селяніна назначаецца акруговым выканаўчым камітэтам. Тэхнічны пэрсанал назначаецца загадчыкам.

6. Загадчык акруговага дому селяніна зьяўляецца прадстаўніком дому ва ўсіх яго зносінах з дзяржаўнымі і грамадзкімі ўстановамі, арганізацыямі і прыватнымі асобамі, заключае ад імя акруговага дому селяніна дагаворы, выдае абавязваючыя і даверанасьці, абаранне інтарэсы акруговага дому селяніна ў судзе і іншых установах, абслугоўвае гаспадарчыя і фінансавыя патрэбы яго, вядзе падлік усяе маемасьці і нагляд за яе захаванасьцю; вядзе перапіску акруговага дому селяніна, складае справаздачы аб яго працы.

7. Акруговыя дамы селяніна знаходзяцца ў акруговых гарадох і маюць гэрбавую пячатку з надпісам «. . . . . Акруговы Дом Селяніна».

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР М. Мароз.

23 сакавіка 1928 году г. Менск.

ПОЛОЖЕНИЕ об Окружных Домах Крестьянина.

1. Окружные дома крестьянина организуются окружными исполнительными комитетами и подведомственны им.

Задачей окружных домов крестьянина является агрономическая, юридическая и другая помощь всем крестьянам, которые непосредственно или письменно обращаются в дом крестьянина, и дача приюта тем крестьянам, которые приезжают в окружный город по своим делам.

2. Окружный дом крестьянина устраивает при доме крестьянина сельско-хозяйственные лекции, беседы, доклады, спектакли, библиотеку-читальню, выставку, музей и кинематограф; ведет агрономическую консультацию; руководит экскурсиями крестьян на фабрики, заводы, широкие рабочие собрания, выставки, музеи; помогает крестьянам приобретать литературу; дает разные советы и справки крестьянам-ходокам и одиночкам по всем правовым вопросам, касающимся крестьянского хозяйства, в частности, по вопросам землеустройства, лесного хозяйства, налоговым, а также разъяснения юридического характера по письменным запросам крестьян; устанавливает взаимную связь и информацию с Центральным Домом Крестьянина БССР и другими окружными домами.

3. Окружныя дома крестьянина пользуются всеми правами юридического лица и имеют право приобретать и отчуждать всякого рода имущество, вступать в обязательства с государственными, общественными и частными учреждениями, организациями и лицами, принимать имущество в дар, выдавать доверенности, заявлять претензии и отвечать на суде.

4. Окружные дома крестьянина находятся на окружном бюджете.

5. Заведующий окружным домом крестьянина назначается окружным исполнительным комитетом. Технический персонал назначается заведующим.

6. Заведующий окружным домом крестьянина является представителем дома во всех его сношениях с государственными и общественными учреждениями, организациями и частными лицами, [illegible] имени окружного дома крестьянина [illegible] доверенности, выдает обязательства и [illegible] доверенности, защищает интересы окружного дома крестьянина в суде и в других учреждениях, обслуживает хозяйственные и финансовые нужды его, ведет учет всего имущества и наблюдает за его сохранностью, ведет переписку окружного дома крестьянина, составляет отчеты о его работе.

7. Окружные дома крестьянина находятся в окружных городах и имеют гербовые печати с надписью „. . . . . Окружный Дом Крестьянина".

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Управляющий делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР М. Мороз.

23 марта 1928 г. г. Минск.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

„УЗВЫШША".

ЧАСОПІСЬ ЛІТАРАТУРЫ, МАСТАЦТВА І КРЫТЫКІ.

У сваіх артыкулах часопісь „Узвышша" паставіла вось якія пытаньні:

І. ШЛЯХІ РАЗЬВІЦЬЦЯ БЕЛАРУСКАЕ ПРАЛЕТАРСКАЕ ЛІТАРАТУРЫ.

Тэзісы да цытаньня аб утварэньні „Узвышша" (часопісь „Узвышша" № 1 за 1927 г.).

2. СУВЯЗЬ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ З ЧЫТАЧАМІ.

Ліст ад рэдакцыі «Узвышша» да чытачоў (№ 2).

3. ПРАБЛЕМЫ ПАЭТЫКІ.

А. Агульныя пытаньні.

1. Праф. А. Вазьняясенскі. Паэмы Янкі Купалы. Сюжэтная пабудова і стыль.
2. Я. Плашчынскі. Кніга лірыкі, як мастацкае цэлае. „Вінок" М. Багдановіча (№ 1 за 1927 г.).
3. А. Бабарэка. З літаратурных нататак (№ 1).
4. Праф. І. І. Замоцін. М. Багдановіч. Крытычна-біаграфічны нарыс (№ 2, 3 і 5).
5. А. Бабарэка. Багдановіч у літаратурных анэкдотах (№ 2).
6. А. Бабарэка. Паэма «Сымон Музыка» Я. Коласа (№ 3).
7. К. Кундзіш. Sine ira et studio (агляд паэзіі Ц. Гартнага) (№ 3).
8. С. Замбрыцкі. Напяваньне чужога халата (№ 3).
9. Юры Бярозка. Коласава алегарычная новэла (№ 4).
10. А. Г Барыцэўскі. Праблема паэтыкі ў новай кніве О. Вальцэля (№ 4).
11. Адам Бабарэка. Аб разуменьні мастацкай творчасьці і аб некаторых пытаньнях у вывучэньні беларускай літаратуры (№ 5).
12. К. Кундзіш. Альбо грай, альбо скрыпку аддай (агляд творчасьці А. Александровіча) (№ 5).
13. Адам Бабарэка. Творчасьць Ул. Дубоўкі, як форма нацыянальнай сьвядомасьці пралетарскага характару (№ 6).
14. Ант. Адамовіч. Максім Гарэцкі (№ 1, 1928 г.)
15. А. Бабарэка. Творчасьць Ул. Дубоўкі (№ 1, 1928 г.)

Б. Драматургія.

16. Праф. І. І. Замоцін. Беларуская драматургія (№ 1, 1927 г.)
17. Яр. Драматычны элемэнт у творчасьці нашых продкаў (№ 1, 1927 г.)

В. Прыгодніцкая літаратура.

18. Юры Бярозка. Праблемы прыгодніцкага раману (№ 2).

Г. Вывучэньне беларускага фольклёру.

19. Ул. Дубоўка. Рыфма ў беларускай народнай творчасьці (№ 3).
20. К. Атраховіч. Беларускія прыказкі (№ 6).

4. КУЛЬТУРА МОВЫ.

1. Ул. Дубоўка. Пра нашу літаратурную мову (№ 2).
2. Ул. Дубоўка. Некаторыя прыватныя выпадкі літаратурчасьці нашае мовы (№ 4). 3. Адмысловы аддзел «Культура мовы» ад № 5 праз усе далейшыя.

5. ТЭАТР.

1. Праф. А. Вазьняясенскі. Сучасны беларуск. тэатр. (№ 3). В. Вольскі. Татарскі тэатр (№ 5).

6. МУЗЫКА.

1. Ул. Дубоўка. Да пытаньня аб беларускіх мэлёдыях у творчасьці Шопэна (№ 1, 1927 г.).
2. Праф. М. М. Ігнатоўскі. Іванаў. Бэтховэн (№ 3).
3. Ю. Дрэйзін. Кастрычнік і беларуская музыка (№ 5).

7. БАЛЕТ.

1. ЯР. Праз «учора» ў «заўтра» (№ 1, 1927 г.)

8. КУЛЬТУРА НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕНШАСЬЦЯЙ БССР.

1. Віт. Вольскі. Наконт нацыянальнай літаратуры беларускіх татар (№ 4). 2. Вольскі. Асноўныя прыпцыпы арабскай транскрыпцыі беларускага тэксту у „кітабах" (№ 6).

9. ІНШАКРАЁВЫЯ ПРАЛЕТАРСКІЯ ЛІТАРАТУРЫ.

1. І. Скрыблюнас. Юліус Янонис (№ 2).
2. Ю. Бярозка. Расейская мастацкая проза за 1926 г. (№ 3).
3. Ц. Саарунэ. Кароткі нарыс армянскай літаратуры (№ 8).
4. З. Сьнежка. Літаратурная Японія (№ 3).
5. Г. Таўзаршвілі. Асноўныя віткі разьвіцьця грузінскае літаратуры (№ 4).
6. З. Сьнежка і Пэрго. Фінская літаратура (№ 4).
7. З. Сьнежка. Кастрычнік і замежная літаратура.
8. Праф. І. І. Замоцін. Расейская мастацкая літаратура ў перыяд 1917-1928 г. г. (№ 6).
9. З. Сьнежка. Баўгарская пралетарская літаратура (№ 6).
10. З. Сьнежка. Бэльгійская літаратура (№ 1, 1928 г.).

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ на часопісь „УЗВЫШША" (другі год выданьня).

„Узвышша" выходзіць памерам ад 12 да 15 друк. аркушаў.

УМОВЫ ПАДПІСКІ: на год (6 нумароў) 7 руб., на паўгода (3 нумары) 4 руб.

КОШТ А